КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 36 (212) ◂ 8 кастрычніка ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



УЛАДЗІМІР КАЦОРА

Стар. 4

**БУДУЕМ ГОРЫ СМЕЦЦЯ**
Дастаткова заехаць у лес ці на бераг вадаёму, каб пабачыць адыходы жыццядзейнасці чалавека, якія «ўпрыгожваюць» ландшафт
Стар. 5

**СПРАВА НРА**
Працягваюцца арышты па справе спробы падпалу расійскай амбасады. У тым, што зараз адбываецца, ёсць пэўная аналогія са справай «Новай рэвалюцыйнай альтэрнатывы»
Стар. 11

**ЭКЗАМЕН ДЛЯ МІНІСТРА ЛАТУШКІ**
Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**300 ГАДОЎ МІНСКАЙ КАТЭДРЫ**

Нарыс Аляксея Хадыкі

▸ ВЫБАРЫ

# ПРЫХАВАНЫ ПРАЦЭС БРАДЖЭННЯ

**Першы тыдзень збору подпісаў паказаў гатоўнасць беларусаў да пераменаў. Кіламетровых чэргаў да пікетаў альтэрнатыўных дзейснаму кіраўніку Беларусі кандыдатаў у кандыдаты не назіраецца, аднак выразнага страху няма. Людзі ўголас выказваюцца за змены ў краіне. І адначасова не вераць, што гэта магчыма.**




Па інфармацыі штабоў апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты, за першыя 5 дзён працы змаглі сабраць ад 13 да 22 тысяч подпісаў. Ці насамрэч праца вядзецца такімі ўдарнымі тэмпамі, пакажа час, але актыўнасць некаторых кандыдатаў па меншай меры радуе.

У сераду ў Мінску лідэр кампаніі «Гавары праўду», паэт Уладзімір Някляеў на цэнтральным праспекце побач з ГУМам арганізаваў сапраўдны палітычны спектакль. Відовішча з натоўпам людзей, сцягамі кампаніі, музыкай і спевамі выклікала думкі: ці хутка з'явіцца АМАП, каб разагнаць зарваўшыхся апанентаў рэжыму.

Насамрэч, палітычная кампанія і мусіць быць яркай, відовішчнай, пазітыўнай. За апошнія 16 гадоў ад гэтага эфектыўна адвучылі. Людзі глядзелі на шоў, некаторыя даставалі пашпарты і ставілі подпісы за Някляева, Раманчука, Саннікава, Кастусёва. Аргументацыя паводзінаў простая: хочацца пераменаў. Але на пытанне: «Ці магчымыя перамены?» большасць адказвала — «не». Вось такі дысананс жадання і магчымага.

У прыватных размовах некаторыя аналітыкі такі разгул лібералізму патлумачылі тым, што Някляеў — таемны праект кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміра Макея, кандыдат для наменклатуры. Паэт-палітык часам удала грае на струнах душы чыноўнікаў, як, напрыклад, у выпадку стварэння адмысловага інфармацыйнага сайту «Улада за кратамі», дзе збіраецца інфармацыя пра асуджаных чыноўнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў па прынцыпу «ніхто не забыты». Гэта дае падставы хіба што пладзіць розныя версіі. Магчыма, ісціна недзе побач, але даведацца, дзе канкрэтна, пакуль не выпадае.

Калі ж гаварыць пра лідэраў, то гэта адназначна сябры рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» — яны збіралі подпісы за Аляксандра Лукашэнку. І, па словах міністра адукацыі Аляксандра Радзькова, кіраўніка ініцыятыўнай групы, ужо маюць больш за 100 тысяч подпісаў у падтрымку Аляксандра Рыгоравіча. Аднак на гэтым удзел ініцыятыўнай групы ў пікетах і зборы подпісаў не будзе скончаны. Лукашэнка выказаў пажаданне, каб за яго прагаласавалі дзве трацiны выбарцаў, заданне з подпісамі, напэўна, больш сціплае. У перадвыбарнай кампаніі 2006 года за вылучэнне Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам на пасаду прэзідэнта краіны было сабрана больш 1,9 мільёна подпісаў.

Увогуле, улады спрабуюць максімальна стварыць ілюзію правільных, сапраўдных выбараў. Але ж усе памятаюць, хто лічыць галасы. Заходу дэманструецца лібералізм вулічнай палітыкі — у пікетах хоць песні спявайце, хоць са сцягамі стойце, па максімуму зарэгістравалі ініцыятыўныя групы, Аляксандр Лукашэнка нават не прэтэндуе на элегантныя 87 працэнтаў. «Калі на гэтых выбарах будзе 70–75% — не трэба 87% або 95%, як было мінулы раз, — гэта будзе вельмі добра», — сціпленька прызнаўся ў добрых намерах кіраўнік Беларусі.

Расія, у адрозненні ад Еўрасаюза, на падзеі глядзіць цвяроза і сказанаму не верыць. Дзярждума Расіі прыняла заяву аб адносінах з Беларуссю ў адказ на палітыку Лукашэнкі. «Антырасійская рыторыка, якую выкарыстоўвае цяпер кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь, выклікае здзіўленне і поўнае непрыманне ў расійскага народа, а таксама ідзе насуперак з агульным гістарычным лёсам двух народаў, супярэчыць духу шматвяковых культурных і эканамічных сувязяў, а таксама нашаму жыццю і мысленню», — гаворыцца ў заяве.

Тэкст дакумента, у напамін пра мары аб саюзнай дзяржаўнасці, пачынаецца са слоў: «Беларусь з'яўляецца важным стратэгічным саюзнікам Расіі. Актыўнае ўзаемадзеянне ў сферы эканомікі, бяспекі, вайсковага будаўніцтва ўмацоўвае міжнародныя пазіцыі нашых дзяржаў, спрыяе росту дабрабыту нашых грамадзян».

Віцэ-спікер Дзяржаўнай Думы Расіі Уладзімір Жырыноўскі, выступаючы на тэлеканале «Россия 24», назваў паводзіны Аляксандра Лукашэнкі хамскімі. «Няўжо ён думае, што Расія прызнае вынікі выбараў, няўжо ён думае, што ўсе заплюшчаць вочы на фальсіфікацыі? — пытаўся ў эфіры Жырыноўскі, і сам адказваў: — Сумленна ён гэтыя выбары не выйграе, мае падтрымку 20 працэнтаў, ад сілы — 30...» А праз дзень на расійскім тэлеканале НТВ з'явілася чацвёртая частка фільма «Хросны бацька. Апошняя восень» пра Аляксандра Рыгоравіча і тое, «як дэпутацкі мандат выратаваў Лукашэнку ад турмы, хто інсцэніраваў самагубства журналіста Алега Бябеніна, і як забівалі іншых?» Вось такое сяброўскае кіно і стратэгічнае партнёрства.

Увогуле, чым бліжэй да выбараў, тым больш інтрыга: ці саспее да 19 снежня краіна да пераменаў? Інтарэс выклікае не сама працэдура, а паслявыбарчыя працэсы, бо ўсё паказвае на тое, што ціха-мірна не абыдзецца. Апошняе апытанне НІСЭПД паказала, што 38,5 працэнта рэспандэнтаў не задаволеныя канцэнтрацыяй улады ў руках аднаго чалавека і не бачаць у гэтым карысці, а 43,2 працэнта хочуць бачыць наступнага кіраўніка Беларусі, які будзе прыхільнікам кардынальных зменаў цяперашняга курсу.

ВЫБАРЫ

# ПРЫМУШАЮЦЬ ПАДПІСВАЦЦА

Генадзь КЕСНЕР

**У беларускай глыбінцы маюць месца выпадкі, калі людзей папросту прымушаюць ставіць свае подпісы за вылучэнне кандыдатам у прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. Пра адзін з такіх выпадкаў паведаміў, актывіст ініцыятыўнай групы па вылучэнню Яраслава Раманчука Кірыл Семянчук.**

Кірыл Семянчук пражывае ў вёсцы Азёры Гродзенскага раёна. Паводле яго слоў, там маюць месца парушэнні выбарчага заканадаўства з боку кіраўніцтва СВК «Азёры».

«Кіраўнікі СВК у прымусовым парадку загадалі людзям, якія працуюць у гэтым калгасе, прынесці раніцай 4 кастрычніка пашпарты, — распавядае актывіст. — Некаторыя адразу ж паставілі свае подпісы ў падтрымку вылучэння прэзідэнта Лукашэнкі Аляксандра Рыгоравіча. Людзям сказалі, што пашпарты ім вернуць увечары. Большасць людзей паставілі свае подпісы за вылучэнне Лукашэнкі ўжо ўвечары. Гэтаму ёсць відавочцы, людзі прыходзілі да мяне і распавядалі пра гэты выпадак. Людзей фактычна добраахвотна-прымусова змусілі паставіць свае подпісы. Прымусілі падпісвацца ўсіх — і трактарыстаў, і тых, хто працуе ў вялікім калгасным садзе, на жывёлагадоўчых комплексах. У людзей папросту забіраюць пашпарты, забіраюць бланкі. Хтосьці проста не хацеў прадпісвацца, хтосьці не прынёс пашпарт, але да іх адразу ж былі прэтэнзіі з боку кіраўніцтва СВК: маўляў, што гэта за стаўленне такое, начальнік сказаў — значыць, трэба зрабіць».

Вось так «дэмакратычна» зноў вылучаюць у прэзідэнты дзейнага кіраўніка Беларусі.

АКЦЫЯ

# ЗНАЙШЛІ СВОЙ ДОМ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Для 64 бяздомных жывёл у мінулую суботу скончыліся пакутлівыя нягоды. Падчас акцыі, прымеркаванай да Міжнароднага дня абароны жывёл, 33 сабакі і 31 кот нарэшце займелі свой дом і гаспадароў.**



Мерапрыемства арганізавала грамадскае аб'яднанне абароны жывёл «Эгіда». Для тых, хто прыйшоў 2 кастрычніка ў мінскі парк Горкага, стараўся цудоўны настрой. Гэтаму паспрыялі ўдзельнікі фальклорнага калектыву «Фламмея», дзіцячага музычнага калектыву з адукацыйна-прадзюсерскага цэнтру «Аванці», танцавальна-спартыўнага клуба «Актар». На акцыі выступілі і спявак Шыр, дуэт Аляксандра і Канстанцін. Гэта пара, дарэчы, не першы раз падтрымлівае такія мерапрыемствы.

На адно з іх Аляксандра і Канстанцін прыехалі выступаць, а з'ехалі адтуль з вялікім дварняком Арыяй. Гэтым разам музыкі выступалі на сцэне са сваёй любіміцай, якой нават прысвяцілі песню. Яна хадзіла змейкай паміж ног у Аляксандра, лажылася, каталася, выконвала любыя каманды. Музыкі з задавальненнем паказалі, якой стала іх выхаванка.

І Арыя была не адзінай сярод чатырохногіх, кім ганарыліся гаспадары. На сцэне выступалі сабакі, якіх бралі са зламанай псіхікай. А цяпер на сцэне яны дэманстравалі поўнае паразуменне са сваімі гаспадарамі.

Мініяцюрную інсцэніроўку супраць нашэння футраў паказалі дзеці. А пасля пабеглі раздаваць улёткі, што называліся «Цана футра». Разышлася і газета «Сябры жывёл», не засталося ніводнага нумара. Цэлы дзень падчас акцыі давалі кансультацыі кваліфікаваныя ўрачы клінікі «ДоктарВет». А валанцёры выходзілі на сцэну, выносілі сваіх жывёл і распавядалі гісторыі сваіх падапечных.

«Мы даводзім, што існуе праблема безнаглядных жывёл, — кажа Наталля Бялянава, кіраўнік «Эгіды». — Але гэтыя жывёлы таксама маюць права на жыццё, права мець гаспадара. Сёння ў нас існуе кругаварот: адлоўліваюць — забіваюць. А Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі як давала зводку, што за год адлоўлена і знішчана 70–80 тысяч бяздомных жывёл, так гэта лічба практычна не мяняецца. Адловам і забойствам вырашыць гэту праблему немагчыма. І гэта толькі жывёлы, якія афіцыйна знішчаны. Велізарная частка знішчаецца неафіцыйна. Жывёл забіваюць, іх вешаюць, іх душаць, адстрэльваюць. І гэтай статыстыкі мы з вамі не даведаемся».

*P.S.: На сайце www.egida.by штодня больш за 300 жывёл шукаюць сабе гаспадара. У каталогу размяшчаецца фотаздымак, гісторыя кожнай жывёлы, тэлефоны апекуна. «Эгіда» таксама будзе ўдзячная любой дапамозе. У тым ліку з кормам, напаўняльнікамі, латкамі, лекамі, аплатай стэрылізацыі. Вялікая патрэба ёсць і ў валанцёрах для дагляду за жывёламі. Хто можа зрабіць ахвяраванні, разлiковы рахунак — 3015000004266 АСБ «Беларусбанк ф-л № 500 Мінскае ўпраўленне, код 601, УНП 101860476, прызначэнне плацяжу: ахвяраванне. За інфармацыяй звяртайцеся па тэл. +375 29 630 79 33 (Наталля Бялянава).*

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# МАЛІТВАЙ І СПРАВАЙ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Выступы бардаў, моладзевых лідэраў і кандыдатаў у прэзідэнты: штодзень а 19-й гадзіне ля касцёла святога Язэпа ў Мінску гучаць малітвы за яго вяртанне вернікам.**

Змагароў за святыню падтрымаў і пісьменнік Уладзімір Арлоў. Ён прыйшоў на сустрэчу з тымі, хто ўжо больш за 20 дзён кожны вечар збіраецца ля храма. На яго прыступках пісьменнік прыгадаў Полацк свайго дзяцінства.

— У мурах Сафійскага сабора тады былі зваленыя кнігі, — распавёў ён. — Такая велізарная піраміда, якую мы бачылі, калі глядзелі ў вокны. Як мне потым стала вядома, туды звозілі кнігі «сумнеўных» аўтараў, якія выехалі за мяжу, нечым правінаваціліся перад савецкай уладай. Вось гэта піраміда, кінутая на вырак лёсу, у мяне і цяпер стаіць перад вачыма.

А ўзімку 1964 года ў Полацку ўзарвалі сабор святога Стэфана. «На месцы таго сабора, прыгажосць якога і, можа быць, дух якога мы яшчэ толькі дзіцячымі сэрцамі, а не розумамі маглі спасцігнуць, мы ўбачылі велізарную крушню, — расказаў Уладзімір Арлоў. — На некалькі дзесяткаў метраў у вышыню — куча камення. Гэта адзін з моцных і вострых успамінаў у майго дзяцінства. Тады ў нас у дзіцячыя душы можа ўпершыню прыйшла думка, што дарослыя таксама могуць памыляцца. Што ў нас на вачах здзейснілася нейкае злачынства».

На думку пісьменніка, зараз, калі храмы і не руйнуюцца, шмат якія з іх па-ранейшаму ў небяспецы. Над імі вісіць дамоклаў меч знішчэння альбо чалавечымі рукамі, альбо проста часам, стыхіяй ці надвор'ем.

Уладзімір Арлоў падарыў змагарам за касцёл сваю кнігу «Імёны свабоды», якая выйшла ў бібліятэцы «Радыё Свабода». У ёй дзясяткі старонак прысвечаныя змагарам за свабоду веравызнання. «Гэтае змаганне яшчэ, як мы бачым, не скончылася. Але я веру, што прыйдзе час, калі мы ўсе сустрэнемся ў касцёле святога Язэпа на малітве», — лічыць Уладзімір Арлоў.



Уладзімір Арлоў

Як вядома, зараз у касцёле знаходзяцца два дзяржаўныя музеі. Аднак побач камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінская спадчына» будуе гатэльны комплекс. І за касцёлам плануецца замацаваць частку гатэля. «Але я проста шчыра веру, што да гэтага не дойдзе. І гэты храм будзе вернуты вернікам», — кажа адна з удзельніц пратэсту, сябра БХД Ірына Губская.

— Гэта святыня — культурная спадчына, — падкрэсліла яна. — Мы як беларусы не можам аддаць яе ў варварскія рукі ўлады. Храм Божы павінен належыць вернікам. Гэта аксіёма. І ў месцы, дзе стагоддзямі манахі і вернікі ўзносілі свае малітвы да Бога, гэта павінна працягвацца. Як дзіцёнка аднойчы хрысцілі, і ён заўсёды ёсць дзіцём Божым. Так і храм, аднойчы асвечаны, заўсёды з'яўляецца месцам святым.

Арганізатары акцыі атрымалі лісты на свае звароты ад адміністрацыі прэзідэнта, Палаты прадстаўнікоў і «Мінскай спадчыны». Камунальнае прадпрыемства заявіла, што не збіраецца мяняць свае планы. А два другія адрасаты «спусцілі» звароты ў іншыя інстанцыі. «Цэлы пакунак бюракратычных адказаў, — падсумаваў лідэр БХД Павел Севярынец. — Будзем іх абмяркоўваць і дасылаць новыя звароты».

Нагадаем, што за гэты час міліцыянты двойчы затрымлівалі ўдзельнікаў акцыі. Спыніць яе гэта не змагло. Зараз супрацоўнікі ў цывільным вымушаны кожны вечар выконваць свае прафесійныя абавязкі ля касцёла святога Язэпа. Яны пільна сочаць за тым, што там адбываецца, але не ўмешваюцца. А аператар у цывільным увесь час неадрыўна здымае сустрэчы на відэа. Як жартуюць вернікі, яго працу для гісторыі немагчыма ацаніць. Цяпер яны ведаюць, дзе шукаць для нашчадкаў самыя поўныя матэрыялы пра сённяшнія падзеі — у архівах МУС і КДБ.

СВЯТА

# GAUDIUM ET SPES

Вольга ХВОІН

**Мінскі Архікатэдральны касцёл Імя Найсвяцейшай Панны Марыі на гэтым тыдні адзначае 300-годдзе кансэкрацыі.**

Дэвізам святкаванняў было абрана лацінскае выслоўе «Gaudium et spes» — «Радасць і надзея». Урачыстасці з гэтай нагоды будуць мець перш за ўсё душпастырскі характар. Святкаванню папярэднічала праведзенне спецыяльнай 9-дзённай навэнны ва ўсіх парафіях Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. У мінскай архікатэдры яна ўключала ружанцовую малітву, святыя Імшы і штодзённае агучванне рэфератаў на эклезіялагічную, іерархічную, літургічную або гістарычную тэматыку.

У святкаванні, акрамя душпастыраў і вернікаў Беларусі, прымуць удзел шматлікія госці з-за мяжы. Як паведаміў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, у ліку запрошаных — прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх структур, дыпламаты, іерархі і служкі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, патрыяршы экзарх усёй Беларусі, а таксама пасланец Папы Рымскага Бенедыкта XVI кардынал Ёзэф Томка — былы прэфект ватыканскай Кангрэгацыі евангелізацыі народаў, які будзе казаць сваю прапаведзь па-беларуску. «Гэта ёсць знакам павагі да Беларусі і нацыянальнай культуры, салідарнасці з беларускімі каталікамі і ўсюдыснасці касцёла», — зазначыў архібіскуп.

Кардынал Томка плануе сустрэцца з мітрапалітам Філарэтам і прадстаўнікамі ўлады, 10 кастрычніка ён узначаліць імшу ў Маладзечанскім касцёле Святога Ёзэфа, дзе таксама скажа пропаведзь па-беларуску.

У Мінскім Архікатэдральным касцёле плануецца ўстанавіць дзве мемарыяльныя дошкі: у гонар 300-годдзя асвячэння храма і з імёнамі святароў, якія служылі ў касцёле з 1710 па 1945 гады.

Мінскі архікатэдральны касцёл імя Найсвяцейшай Панны Марыі быў заснаваны езуітамі 31 ліпеня 1700 года. 16 сакавіка 1710 года храм асвяціў біскуп Віленскі Канстанты Казімір Бжастоўскі. У 1798 годзе святыня была ўдастоена статуту кафедральнага касцёла. У пасляваенны час храм быў адабраны ў вернікаў і аддадзены пад Дом фізкультуры. У 1951 годзе святыня была цалкам спустошаная і перабудаваная. 9 снежня 1993 года пастановай беларуская ўрада будынак вярнулі католікам. Вялікі ўнёсак у аднаўленне касцёла зрабіў кардынал Казімір Свёнтэк.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КАПЕЦ САЮЗУ?

*Сяргей САЛАЎЁЎ*




**Здаецца, персанальная спрэчка спадароў Мядзведзева і Лукашэнкі ўступіла ў завяршаючую, то бок палітычную фазу. Пасля гучных абвінавачванняў, закінутых Лукашэнкам у бок Мядзведзева, і Мядзведзевым у бок Лукашэнкі, стала відавочна: паразумення гэтыя людзі паміж сабой ужо ніколі не знойдуць. Але Бог з ім, з паразуменнем. Больш за ўсё Аляксандра Рыгоравіча зачапіла іншае.**

Яго зачапілі заявы з расійскага боку пра тое, што місія назіральнікаў ад СНД ацэніць беларускія выбары «адэкватна». І тое, што, як падаецца, СНДэшныя назіральнікі зараз будуць шчыльна супрацоўнічаць з назіральнікамі ад АБСЕ. Калі раней назіральнікі ад СНД заўсёды казалі «адабрамс» беларускім выбарам, Расія іх прызнавала празрыстымі, а Лукашэнку — легітымным, то АБСЕ казала наадварот. Зараз цалкам можа адбыцца так, што назіральнікі ад АБСЕ і СНД зоймуць супольную пазіцыю. І якой будзе гэта пазіцыя — няцяжка прагназаваць.

І вось інфармацыйнае агенцтва «Рэгнум» выдае навіну. Спасылаючыся на неназваную крыніцу ў Мінску, нібыта непублічна Аляксандр Лукашэнка заявіў, што, у выпадку непрызнання Расіяй ягонай перамогі на выбарах, Беларусь спыніць свой удзел ва ўсіх асноўных інтэграцыйных структурах постсавецкай прасторы. Гэта тычыцца Саюзнай дзяржавы, СНД, АДКБ (як следства — у Калектыўных сілах аператыўнага рэагавання АДКБ), Мытным саюзе. Пэўна, такі ж лёс чакае і ЕўрАзЭс. Быццам бы, у выпадку непрызнання выбараў, ён адразу становіцца нелегітымным для ўсіх гэтых структураў. Адпаведна, нелегітымным з'яўляецца і прысутнасць Беларусі ў гэтых аб'яднаннях.

Заява, канешне, моцная, але толькі ў тым выпадку, калі яна сапраўды была, што выклікае моцныя сумневы. Па-першае, што гэта за неназваная крыніца? Прычым крыніца, якая блізкая да «непублічных заяваў» Лукашэнкі, то бок вельмі высокага ўзроўню? Па-другое, адкуль такая крыніца ў «Рэгнума», прадстаўніцтва якога афіцыйна ў Беларусі няма? Было б зразумела, калі б гэта быў «Інтэрфакс» альбо РИА «Новости», а тут — нейкае пазаштатнае агенцтва з такімі «высокімі крыніцамі»?

Хутчэй за ўсё, агенцтва «Рэгнум» выкарыстаExternal, каб «зліць» патрэбную інфармацыю і ў чарговы раз папужаць Расію — не прызнаеце нашы выбары, нічога вам не будзе, як у анекдоце: «Ні сядла, ні каня, ні шашкі». Ні СНД, ні СД, ні Мытнага саюза.

Але наўрад ці гэтым можна кагосьці напужаць. Як вожыка голым азадкам. Бо СНД ужо саваё амаль аджыў, і выкарыстоўваецца толькі экстрэмальным турыстам Паўлам Палычам Барадзіным для імітацыі бурнай дзейнасці і атрымання грошай ад дзвюх матак — Беларусі і Расіі. Саюзная дзяржава выгадна хутчэй Беларусі, чым Расіі, — для доступу беларускіх тавараў на аб'ёмны расійскі рынак. Тое ж, дарэчы, Беларусь хацела атрымаць і ад Мытнага саюза.

А зараз уявім, хто больш узрадуецца, калі раптам з'явіцца сапраўдная мяжа паміж Беларуссю і Расіяй. Зразумела, больш узрадуецца Расія. Тады яна са спакойным сумленнем можа браць мытныя пошліны не толькі з беларускіх тавараў (зразумела, усталяваўшы льготныя стаўкі на тое, што ім сапраўды патрэбна), але і забяспечыць тое, чаго яна ўжо доўгі час дамагаецца ад беларускага кіраўніцтва. А канкрэтна — увесці свае мытныя пошліны на патрыманыя іншамаркі, якія пераганяюцца праз Беларусь у Расію. І падтрымаць сваю «Ладу — Калеку», вядро з гайкамі.

А што з гэтага займее Беларусь? Ды, бадай, нічога, апроч таго, што ў Беларусь скароціцца паступленне расійскай прадукцыі. То бок, зноў узнікне дэфіцыт грэчкі, якасных макаронаў з цвёрдых гатункаў пшаніцы, магчыма, рыбы і гэтак далей.

Таму Расія паводзіць сябе так упэўнена. І ўжо з вуснаў міністра фінансаў Расіі Аляксея Кудрына гучаць абвінавачванні Беларусі ва ўтрыманстве.

Мінск пры падрыхтоўцы двухбаковых праектаў пастаянна ціснуў на Маскву, каб атрымаць дадатковыя грошы, заявіў 5 кастрычніка журналістам Кудрын. «Пры падрыхтоўцы ключавых момантаў нашай Саюзнай дзяржавы, нашых сумесных праектаў мы адчуваем нейкі ўціск аб неабходнасці дадаткова з боку Расіі выдаваць грошы або зніжаць цэны на нашы энерганосьбіты, даваць крэдыты. Гэты спіс запытаў вельмі вялікі», — сказаў міністр.

У якасці прыкладу Кудрын прывёў пытанне ўзгаднення праекта аб адзінай валюце. «Два міністэрствы фінансаў, два цэнтральныя банкі адпрацавалі ўсю дакументацыю, поўны набор усёй дакументацыі. Гэты праект быў у высокай ступені гатоўнасці. Тады была пастаўлена ўмова аб дадатковых буйных грантах, гэта значыць бязвыплатных сродках, якія павінны быць перададзены Беларусі як нейкае суправаджэнне гэтага праекта», — сказаў Кудрын.

Міністр фінансаў заявіў, што «пытанні крэдытаздольнасці беларускай эканомікі, яе знешніх даўгоў з'яўляюцца крытычнымі». Пры гэтым Кудрын нагадаў, што раней ужо рабіў падобную заяву. 28 мая 2009 года Кудрын падчас паездкі ў Мінск выказаў сумненні ў плацежаздольнасці Беларусі. Ён заявіў, што Расія не выдасць краіне транш крэдыту ў 500 мільёнаў долараў да таго часу, пакуль Мінск не зробіць крокі па стабілізацыі эканомікі. Ад крэдыту ў расійскіх рублях Беларусь тады адмовілася, а Лукашэнка рэзка раскрытыкаваў Кудрына.

Пнула Аляксандра Рыгоравіча нават структура, з якой ён заўсёды знаходзіў паразуменне. 6 кастрычніка дэпутаты Дзярждумы Расійскай Федэрацыі прынялі заяву адносна расійска-беларускіх узаемаадносінаў. У заяве гаворыцца, што «антырасійская рыторыка, якая ў цяперашні час выкарыстоўваецца кіраўніцтвам Рэспублікі Беларусь, супярэчыць гістарычнаму лёсу рускага і беларускага народаў, супярэчыць духу культурных і эканамічных сувязяў, якія складваліся шмат стагоддзяў, нашаму ладу жыцця і мыслення».

А злоснае НТВ працягвае шпуляць новыя серыі «Хроснага бацькі». У пятніцу а 19:30 паводле мінскага часу будзе паказана чацвёртая частка скандальнага дакументальнага фільму «Хросны бацька». Частка мае назву «Апошняя восень». Гэта ўжо сапраўды празрысты намёк на вынік прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Здаецца, Аляксандру Рыгоравічу засталося толькі адно — тое, што ён абяцаў падчас газавых войнаў. Сысці ў зямлянку, але на калені не стаць.

> Мінск пры падрыхтоўцы двухбаковых праектаў пастаянна ціснуў на Маскву, каб атрымаць дадатковыя грошы, заявіў 5 кастрычніка журналістам Кудрын

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЕНА ЛЕЎЧАНКА



Па выніках чэмпіянату свету па баскетболе лепшай цэнтравой турніру стала беларуска Алена Леўчанка. Алена праводзіла на пляцоўцы ў сярэднім па 26,9 хвіліны за матч, набірала па 14,8 дзейсных бала і здзяйсняла па 8,8 падбора (4-ы паказчык сярод усіх удзельніц чэмпіянату). У сімвалічную пяцёрку гульцоў увайшлі таксама Даяна Таўразі (ЗША), Санча Літл (Іспанія), Ева Віцечкова, а таксама Гана Гаракова (Чэхія), якую журналісты прызналі самым каштоўным гульцом турніру.

Зборная Беларусі на дэбютным чэмпіянаце свету заваявала чацвёртае месца. Першыя тры прызавых месцы ўзялі зборныя Амерыкі, Чэхіі, Іспаніі. Беларускі перамаглі чэмпіёнак 2009 года — аўстраліек, француженак і расіянак.

Пасля перамогі над Расіяй (70:53) у 1/4 фіналу чэмпіянату свету Алена Леўчанка адзначыла якасць гульні сваёй каманды. «Гэта вялізная перамога для Беларусі, для нашай зборнай, для ўсіх нашых заўзятараў. Хочацца нацешыцца момантам трыўмфу, бо, магчыма, ён ніколі больш не паўторыцца. Наша каманда моцная калектыўнымі дзеяннямі, «хіміяй». Гэта мы і паказалі», — цытуюць Леўчанку СМІ.

Па вяртанні ў Беларусь капітан баскетбольнай зборнай Беларусі Наталля Трафімава прызналася журналістам, што пасля паўфіналу з Чэхіяй беларускія спартоўкі не паціснулі рукі суддзям. Па ходзе матчу з чэшкамі суддзі выносілі рашэнні на карысць гаспадынь турніру не толькі ва ўсіх спрэчных сітуацыях, але і не заўважалі відавочных памылак з боку суперніц, а таксама каралі беларусак за парушэнні, якіх яны не здзяйснялі. Але беларуская каманда нават з такім судзействам саступіла толькі ў авертайме (77:81).

### АНДРЭЙ ХАРКАВЕЦ



Міністр фінансаў Андрэй Харкавец ускосна пагадзіўся з меркаваннямі экспертаў, што грунту для запланаванага росту заробкаў у краіне няма. Выступаючы перад Саветам Рэспублікі, ён заявіў, што рэалізаваць абвешчанае падвышэнне заробтай платы будзе складана, перадае БелаПАН.

З 1 лістапада тарыфная стаўка першага разраду павялічваецца да 118 тысяч рублёў (на 31%). Таксама 1 лістапада павялічваецца мінімальны заробак. На лістапад-снежань ён вызначаны ў памеры 400 тысяч рублёў, пагадзінны мінімальны — 2 360 рублёў. Такім чынам, мінімальны заробак павялічыцца на 54,7%, гадзінны мінімальны заробак — на 54,2%.

Андрэй Харкавец нагадаў, што ў мінулым годзе мінімальны заробак не ўздымаўся. А напярэдадні 2010 года ўрад вымушаны быў яго скараціць. Утрымаць падвышаны заробак у наступным годзе, па словах міністра фінансаў, будзе «каласальна складанай задачай». На наступны год бюджэт разлічаны на тое, каб захаваць заробак, якога дасягнулі на канец гэтага года, зазначыў Харкавец.

### ГАННА ХІТРЫК

Былая салістка гурту «ДетиДетей», актрыса Купалаўскага тэатра Ганна Хітрык разам з новым музычным калектывам прадставілі ў Мінску новы праект «Сундук». Запрашаючы на сустрэчу, Ганна пісала на інтэрнэт-сайтах: «Перабіраючы нейк свае ўспаміны апошніх трох гадоў, я падумала, а вось калі б быў музычны куфар, у якім змяшчалася б столькі песень, колькі душы заўгодна. Сядзіш, слухаеш, а скрыначка ўсё грае адну за адной розныя любімыя песенькі — чароўная і вельмі патрэбная рэч!» Праект S*unduk (ад англійскага слова «sound» — «гук») — прэзентавалі публіцы Ганна Хітрык, Юлія Глушыцкая, Павел Чымбаевіч, Андрэй Сапоненка (экс-музыкі групы «ДетиДетей») і гітарыст Клім Лук'янёнак.

Папулярны ж гурт «ДетиДетей» (быў заснаваны ў 2006 годзе акцёрамі Ганнай Хітрык, Дзмітрыем Есеневічам і Міхаілам Зуем) спыніў сваё існаванне. За час працы артысты выпусцілі тры альбомы, апошні з іх пад назвай «Рух» стаў першай беларускамоўнай працай калектыву. Дзмітрый Есеневіч і Міхаіл Зуй таксама заснавалі новы гурт «Или-Или».



ТРЭЦІ СЕКТАР



# УЛАДЗІМІР КАЦОРА

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Неяк у размове са мной акадэмік Радзім Гарэцкі сказаў: «Сёння да палітыкі адносіцца амаль усё, нават мова». Уладзімір Кацора вядомы як адзін з лідэраў трэцяга сектара, але не «кішэннага», таму яго таксама можна аднесці да палітычных «ворагаў народа».**

## Апазіцыя камсамолу

Нарадзіўся Уладзімір 14 лістапада 1956 года, але яго бацька чамусьці абраў іншую дату — 5 студзеня 1957 года. Так са «скарпіёна» ён стаў «казерогам» і будзе адзначаць дзень сваіх народзінаў двойчы. Адзін раз — сапраўдны, другі — па пашпарту.

Месца нараджэння Уладзіміра Кацоры — вёска Шарпілаўка Гомельскага раёна. Маці Ніна Васільеўна (у дзяцінстве ленінградская блакадніца) усё жыццё працавала настаўніцай пачатковых класаў і стала заслужаным настаўнікам БССР. Бацька Аляксандр Антонавіч у саўгасе кураваў партыйныя кадры.

У 1978 годзе Уладзімір скончыў беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту і пачаў працаваць па сваёй спецыяльнасці. Спачатку на Уральскім вагонабудаўнічым заводзе, а потым на ПА «Гомсельмаш».

Праз тры гады ён перайшоў на «камсамольска-партыйную» работу. А яшчэ праз тры — многія з тых, хто гэтаму паспрыяў, шчыра пашкадавалі. Справа ў тым, што ў 1984 годзе Уладзімір Кацора ўзначаліў камітэт камсамола ПА «Гомсельмаш» — 14 000 сябраў арганізацыі, што параўнальна з тагачаснымі райкомамі камсамолу. «Махіна», якую не ўлічваць нельга.

Можна толькі выказаць спачуванне мясцоваму камсамольскаму абкаму, бо «махіна» амаль адразу стала апазіцыйнай. Махінацыі з улікам сябраў арганізацыі і сяброўскіх складак, паказуха ў справах і іншыя «несмяротныя грашкі» абласнога кіраўніцтва не спадабаліся маладому і наіўнаму рамантыку, а сам ён не спадабаўся тым, хто на чужой рамантыцы рабіў асабістую кар'еру.

## Апазіцыя партыі

Зразумела, што, нягледзячы на абвешчаную перабудову, «ярышыстасць» моладзевага лідэра ПА «Гомсельмаш» не магла падабацца «старэйшым таварышам». Асабліва, калі ў 1990 годзе, насуперак меркаванню парткама аб'яднання, ён на моднай тады альтэрнатыўнай аснове абраўся дэпутатам Гомельскага гарадскога савета, стаў сябрам Прэзідыуму і ўзначаліў камісію па рабоце са СМІ і грамадскім арганізацыямі. На гэтым «камсамольска-партыйная» кар'ера Кацоры і скончылася.

Праз чатыры гады, пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года, Уладзімір Кацора і яшчэ восем дэпутатаў публічна ў знак пратэсту супраць абрання А. Лукашэнкі адмовіліся ад мандатаў. Да заканчэння абазначанага адпаведным законам тэрміну заставаўся год.

Выпадак даволі рэдкі для беларускіх апазіцыянераў. Я ўжо не аднойчы пісаў, што некаторыя з іх як занялі ў 1994 годзе акопы «барацьбы з крывавым рэжымам», так і па гэты дзень нікога іншага да іх не падпускаюць, чым не моцна адрозніваюцца ад існуючай улады. Можа, менавіта па гэтай прычыне пройдзе час — і Уладзімір Кацора будзе ў апазіцыі і да многіх з іх.

У 1990 годзе Уладзімір Кацора быў адным з ініцыятараў і заснавальнікаў Аб'яднанай дэмакратычнай партыі, якая ў 1995 годзе аб'ядналася з Грамадзянскай партыяй Васіля Шлындзікава. Акрамя гэтага ён будзе сярод заснавальнікаў і іншых вядомых сёння грамадскіх арганізацый — фонду імя Льва Сапегі, «Прававой ініцыятывы», руху «За свабоду».

Падчас перабудовы многім здавалася, што наша грамадства канчаткова апрытомнела ад кашмару, які называўся «кіруючая роля КПСС». Палітычнае паветра стала амаль вольным. Партыйнае будаўніцтва расло, як на дражджах, але Кацора займаўся не толькі ім. Двойчы (1990 і 1995 гады) ён становіцца кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета РБ. Двойчы парламентарыем не стаў, але быў сярод лідэраў выбарчай гонкі.

Пасля сумнавядомага лістападаўскага 1996 года рэферэндуму ўрэшце стала зразумела, што ў краіне будзе толькі адзін афіцыйны палітык, а ўсе астатнія — «адмарозкі». Легальна рэалізаваць свае грамадска-палітычныя амбіцыі стала магчымым толькі ў трэцім сектары, таму і былі створаны гомельская філія ГА «Прававая ініцыятыва» і грамадскае аб'яднанне «Грамадзянскія ініцыятывы».

**«Грамадзянскія ініцыятывы» аказаліся «крэпкім арэшкам». Яны дайшлі да камітэту па правах чалавеку ААН**

Апошняя арганізацыя даволі паспяхова рэалізавала некалькі адукацыйных, інфармацыйных і праваабарончых праграм, такіх, напрыклад, як «Школа маладога журналіста» і «Лідэр». «Грамадзянскія ініцыятывы» выпускалі калі 20 розных бюлетэняў, сябрамі аб'яднання з'яўляліся больш за 500 чалавек у 17 раённых структурах.

## Апазіцыя «новым»

Думаю, далей няма сэнсу пералічваць нейкія канкрэтныя справы, бо сутнасць работы новага аб'яднання можна зразумець і па назве. Як зразумець і тое, што любая некантралюемая грамадскай дзейнасць не будзе да спадобы новай уладзе. Ёй патрэбны выключна свае ініцыятывы.

Менавіта па гэтай прычыне ў 2003 годзе беларускія ўлады ліквідавалі «Грамадзянскія ініцыятывы» і думалі, што на гэтым будзе пастаўлена кропка. Шчыра кажучы, улады мелі падставы на гэта спадзявацца, бо даволі часта мы бываем сведкамі, калі прэтэнзіі на «ўнікальную сур'ёзнасць» знікаюць разам з ліквідацыяй афіцыйнай рэгістрацыі. Няма ніякага сумнення, што часта арганізацыі і ствараюцца толькі дзеля таго, каб быць «гучна» зачыненымі і адцягнуць увагу грамадскасці ад рэальных праблем.

І справа тут не толькі ў «засланых казачках». Часам бывае так, што нікога нікуды і «засылаць» не трэба. Апазіцыйныя структуры працуюць настолькі непрафесійна, што афіцыйнаму міністэрству юстыцыю не трэба нічога выдумляць. Парушэнні, літаральна, ляжаць на самым бачным месцы, нават цяжка пазбегнуць уражання, што ўсё гэта робіцца ці не наўмысна.

«Грамадзянскія ініцыятывы» аказаліся «крэпкім арэшкам». У пошуках праўды яны дайшлі да камітэту па правах чалавеку ААН і выйгралі там справу супраць сённяшніх беларускіх уладаў. Калі я чую пра падобныя прэцэдэнты, становіцца сумна, што, каб нешта даказаць (другіх варыянтаў, на жаль, няма), грамадзяне вымушаны судзіцца са сваёй радзімай.

Не буду аддаваць каму-небудзь перавагу, але, на мой погляд, менавіта ўплыў на грамадства трэцяга сектару і паспрыяў таму, што ў 2005 годзе адзіным кандыдатам ад апазіцыі стаў Аляксандр Мілінкевіч, а яшчэ раней «адзіным» ледзь не стаў Сямён Домаш. Цалкам натуральна, што Уладзімір Кацора ўзначаліў гомельскі абласны выбарчы штаб Аляксандра Мілінкевіча.

## Апазіцыя «сваім»

«За Мілінкевіча» Уладзімір Кацора тройчы падвяргаўся адміністрацыйным арыштам, бо ўсе сустрэчы з ім улады палічылі несанкцыянаванымі. Гэты юрыдычны капкан ведаюць усе і лічаць яго даволі прымітыўным, бо прыдумаць нешта лепшае ў сучаснай улады не хапае розуму. Робіцца ўсё даволі проста: спачатку нешта наўмысна забараняецца, а потым за парушэнне «судзяць» іншадумцаў. Самае цікавае, што і першыя, і другія добра ведаюць, чым усё скончыцца.

Для Уладзіміра Кацоры гэта кожны раз заканчвалася менавіта так. Баюся памыліцца, але сярод «рэгіяналаў» у яго амаль большы за ўсіх «турэмны шлях». Ва ўсякім выпадку, самы «гучны» для незалежнай прэсы, бо ўсё шэсць разоў за кратамі Кацора трымаў галадоўкі.

Апошняя (адбылася нядаўна) была «сухой». Гэта значыць, не толькі без ежы, але і без вады. Самая небяспечная для здароўя, бо літаральна праз некалькі дзён яна можа скончыцца фатальна.

У 10-ю гадавіну знікнення генерала Юрыя Захаранкі, Уладзімір Кацора з аднадумцамі правёў у Гомелі адпаведную акцыю, якая (як заўсёды) была «несанкцыянаванай», і 25 чэрвеня 2010 года суддзя Цэнтральнага раёна горада Марына Домчанка вынесла арганізатарам прысуд. Кацора атрымаў трое сутак. У знак пратэсту ён абвясціў «сухую» галадоўку ў зале судовых пасяджэнняў.

Працягвалася яна шэсць дзён, першыя тры з якіх прайшлі за кратамі, а тры — у мясцовым офісе Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). Міліцыянты тройчы зрывалі расцяжкі «Галадоўка пратэсту» і разам з камунальшчыкамі замалёўвалі адпаведныя надпісы. Каля яго дома амаль пастаянна «дзяжурыў» міліцэйскі нарад.

29 чэрвеня стан здароўя Кацоры настолькі пагоршыўся, што давялося выклікаць «хуткую дапамогу». Пасля агляду ўрач паставіў перад міліцыянтамі пытанне аб прымусовай шпіталізацыі апазіцыянера. Не атрымалася. Здолелі ўзяць ад Кацоры толькі неабходную папяровую адмову ад шпіталізацыі.

Інакш папросту і быць не магло, бо Уладзімір рыхтаваўся да галадоўкі сур'ёзна. Нават сказаў жонцы, дзе трэба яго пахаваць, калі адбудзецца нешта благое. І гэта невыпадкова, бо ў Гомелі ён лічыцца адным з самых апантаных змагароў з існуючай уладай. Нават цяжка падлічыць, колькі разоў яго штрафавалі, але пра адзін з іх трэба сказаць асобна: Уладзімір Кацора мае сярод апазіцыянераў самы буйны ў Гомельскай вобласці штраф — 50 базавых велічынь. У такую суму беларуская Феміда ацаніла яго спробу нагадаць грамадскасці пра 10 гадоў са дня знікнення Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага.

Калі ў лістападзе 2009 года Кацора быў абраны каардынатарам руху «За свабоду» і добраахвотна пакінуў пасаду намесніка старшыні Гомельскай абласной арганізацыі АГП, ён накіраваў лісты ў прадстаўніцтва ААН у Беларусі, Упраўленне юстыцыі Гомельскага аблвыканкама, падатковую інспекцыі, шэраг замежных амбасадаў, дзе напісаў, што адраджае дзейнасць «Грамадзянскіх ініцыятываў».

Нагадаем, што менавіта ў тыя дні праходзіў так званы Еўрапейскі форум, арганізаваны рухам «За свабоду». Яго фармат, склад удзельнікаў і яго змест зрабілі для Уладзіміра відавочным, што адзінства не будзе не толькі ва ўсёй апазіцыі, але і ў яе нацыянальна-дэмакратычным крыле. Таму ён і адышоў ад каманды Мілінкевіча, склаў з сябе абавязкі каардынатара руху «За свабоду» па Гомельскай вобласці. Іншымі словамі, у чарговы раз адмовіўся ад якіх-небудзь пасад. Але не ад дзейнасці.

Як далей? Пакажа час, а пакуль адназначна можна сказаць толькі тое, што Уладзімір Кацора быць у апазіцыі не баіцца.

З НАГОДЫ

# НАВОШТА ЎЛАДАМ ФОРУМ

Генадзь КЕСНЕР

**Беларускія ўдзельнікі Форума грамадзянскай супольнасці (ФГС) палітыкі Еўрапейскага саюза «Усходняе партнёрства» на прэс-канферэнцыі 4 кастрычніка выказалі сваё стаўленне да ідэі, агучанай старшынёй Грамадска-кансультацыйнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі прэзідэнта, галавы гэтай адміністрацыі Уладзіміра Макея, які 29 верасня заявіў, што ГКС гатовы прадстаўляць Беларусь на Форуме грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства».**

Са слоў Макея, ГКС прыняў рашэнне накіраваць бліжэйшым часам адпаведную прапанову на форум і еўракамісару па пытаннях пашырэння ЕС Штэфану Фюле. Старшыня ГКС адзначыў, што савет «мае вагу ў беларускім грамадстве, і з яго пазіцыяй лічацца ў працэсе прыняцця дзяржаўных рашэнняў». Уладзімір Макей выказаў спадзяванне, што гэта будзе ўлічана Форумам грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства».

Па словах прадстаўнікоў беларускага «трэцяга сектара», сам факт дадзенай заявы Макея пацвярджае наяўнасць у беларускай дзяржавы цікавасці да ўдзелу ў праграме «Усходняга партнёрства», што імі прынцыпова вітаецца.

«Аднак гэта сведчыць пра недастатковую інфармаванасць ГКС аб працэдурах адбору ўдзельнікаў на другі Форум грамадзянскай супольнасці, які адбудзецца ў Берліне 18–19 лістапада 2010 года, а таксама аб выніках працы, зробленай беларускімі грамадскімі арганізацыямі — удзельнікамі форума на нацыянальным і агульнапраграмным узроўні за мінулыя паўтара гады, — адзначыў Нацыянальны каардынатар ФГС УП па Беларусі, кіраўнік Міжнароднага кансорцыума ЕўраБеларусь Улад Вялічка.



Фота аўтара

Уладзімір Вялічка, Сяргей Мацкевіч, Уладзімір Мацкевіч

— Разам з тым, апошнія паўтара гады развіцця праграмы «Усходняга партнёрства» прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, якія бралі ўдзел у працы форума і стварэнні яго нацыянальнай платформы, рэгулярна сутыкаліся з незацікаўленасцю розных структур беларускай улады ў дыялогу з грамадзянскай супольнасцю ў рамках гэтай праграмы».

У якасці прыкладу Улад Вялічка прыгадаў лісты ад імя беларускай дзяржавы, адрасаваныя Еўрапейскай камісіі, у якіх адзначаецца непажаданасць удзелу прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці ў сустрэчах тэматычных платформ «Усходняга партнёрства».

Па словах спікера Форума грамадзянскай супольнасці УП Сяргея Мацкевіча, адрасныя запрашэнні прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў Беларусі, адказных за рэалізацыю працэсаў «Усходняга партнёрства», у тым ліку кіраўніцтва ГКС, на канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы, якія ладзіліся высілкамі грамадзянскай супольнасці, заставаліся без адказу.

Як падкрэсліў Сяргей Мацкевіч, факт безапеляцыйнага адлічэння з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ўдзельніцы першага Форума грамадзянскай супольнасці Таццяны Шапуцькі таксама з'яўляецца пэўнага кшталту дэманстрацыяй стаўлення кіраўніцтва Беларусі да грамадзянскай супольнасці і змушае сумнявацца ў гатоўнасці беларускіх уладаў да канструктыўнага ўдзелу ў праграме «Усходняга партнёрства».

Кіраўнік Агенцтва гуманітарных тэхналогій Уладзімір Мацкевіч адзначыў той факт, што на пасяджэнне ГКС прыбыў сам кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі Сяргей Мартынаў. «Вы можаце ў штодзённай працы міністра замежных спраў вылучыць кавалак, які тычыцца грамадзянскай супольнасці? Звычайна яго не было. Прысутнасць Мартынава сведчыць пра тое, што ён прыйшоў на ГКС не па ўласнай ініцыятыве… Звяртанне ўвагі савета на грамадзянскую супольнасць не трэба разглядаць як ініцыятыву ГКС і нават як ініцыятыву беларускай дзяржавы. Гэта настойлівая прапанова Еўрасаюза», — упэўнены Уладзімір Мацкевіч.

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ІХ ПРАГА ДА БЕЛАРУСІ НЕ МАЕ МЯЖЫ

**Мусіць, толькі адзін з расійскіх гасцей — Уладзімір Рыжкоў — на прэзідэнцкіх выбарах 2006 года адзначыў, што адбываліся яны з парушэннямі, ва ўмовах агульнага ды моцнага ціску і на выбарцаў, і на апазіцыйных кандыдатаў. Але ці не таму, што ён не лічыўся афіцыйным назіральнікам?**




Сёння расіяне абяцаюць, што будуць фіксаваць усе магчымыя парушэнні. Дэманструюць такім чынам сваю зацікаўленасць. А раней яны былі знарок невідушчымі таксама ад зацікаўленасці. Бо ім здавалася, што калі Лукашэнка не ўтрымае ўладу, дык Беларусь уступіць у NATO ды змусіць «рускіх людзей» («соотечественников»), якія трапілі за мяжу не сваёй волі, а праз распад Савецкага Саюза, вывучаць беларускую мову. А зараз ужо і гэта ім не карціць, бо ўбачылі, што з Лукашэнкам немагчыма дамовіцца.

Чаму? Адказ мы добра ведаем — няма той мовы, на якой з Лукашэнкам можна было б размаўляць. Але цяжка зразумець і памкненні Крамля. Хоць яго насельнікі і не карыстаюцца «трасянкай», і маюць у большасці ўніверсітэцкую адукацыю, але відавочна не водзяць сяброўства з элементарнай логікай. Прыкладам, тая патрабуе, каб суразмоўцы карысталіся паняццямі з вызначаным зместам, які б заставаўся нязменным да заканчэння дыскусіі. Тады зробленыя высновы і дамоўленасці можна было зразумець, пагаджацца з імі або не.

Пакуль гэтага няма, і простаму чалавеку цяжка зразумець, чаму сварацца паміж сабой трэці ўжо па ліку прэзідэнт незалежнай Расіі з першым да гэтага часу прэзідэнтам незалежнай Беларусі. З Ельцыным Лукашэнка дамаўляўся наконт дасягнення нейкага «наиболее полного единения народов» (хто разумее, што гэта такое?), з Пуціным — паглыблялі інтэграцыю і стваралі Саюзную дзяржаву. Аж пакуль Пуцін не ўзарваўся ад змястоўнай неакрэсленасці працэсу і не выгукнуў у роспачы: «Котлеты отдельно, мухи отдельно!» Гэта было сумленна, ад розуму і сэрца. Крык душы: «Ці вы з намі, ці супраць нас? Адкажыце!»

Але не ўсё могуць нават каралі, не кажучы пра расійскіх прэзідэнтаў. Таму Пуцін мусіў задаволіцца адказам — не з вамі і не супраць, і не стаўце, крамлёўска-піцэрскія панове, палкі ў калёсы інтэграцыі, дапамагайце шчырым беларусам ствараць саюзную дзяржаву. Бо калі пойдуць на Маскву немцы, то мы пад танкі касцямі не ляжам.

Не, крамлёўцы не напужаліся такім ультыматумам, бо ведалі, чаго на самай справе ён каштуе. Але іх прага да Беларусі не мае мяжы, таму давялося рабіць выгляд, што, як некалі казаў Сямён Шарэцкі, усё будзе добра. Праз нейкі час абвясцілі тым, хто нічога не разумее, што Саюзную дзяржаву ўжо стварылі. Маўляў, хто здольны бачыць, той убачыць Пашу Барадзіна, які сноўдае паміж Масквой і Мінскам, як некалі «чаўнакі» паміж Камароўкай і стамбульскімі базарамі. І ўжо Барадзін заявіў, што ў хуткім часе да яго Саюзнай дзяржавы далучацца іншыя краіны. Але, мусіць, іншыя краіны зацікавіліся, хто будзе насамрэч кіраваць саюзнай дзяржавай, які ўрад і які прэзідэнт. Пад Лукашэнку ім было б смешна пайсці, але ж і не пад Пуціна, не пад Мядзведзева ці іншага крамлёўскага ўладара. Вядома, быць першым у вёсцы, асабліва ў роднай, значна лаўчэй, чым другім у чужой, імперскай сталіцы. Таму і не далучыліся.

Вось на самай справе цана пытання, як яе бачыць кожны нармальны чалавек. А памкненні двух целаў заняць адно месца толькі ў любошчах даюць асалоду. І мусіць нездарма Лукашэнка жаліцца кожнаму, што яго пастаянна спрабуюць «наклонять». Але ж з эталогіі вядома, што гэта робяць толькі з тымі, хто падстаўляецца.

У сваім «відэаблогавым звароце» да беларусаў і расіянаў Дзмітрый Мядзведзеў фактычна працятаваў тое, што Лукашэнка гатоў сказаць, хоць яго сярод ночы падымі: «Мы заўжды будзем памятаць, што нашы народы — а мне заўсёды карціць сказаць: наш адзіны народ — панеслі вялізныя страты...» Адсюль выснова: «Калі мы адзіны народ, то якія могуць быць рахункі?» А з Крамля, ужо і па сеціве, паведамляюць, што ўвесь праект мае для Расіі сабекошт у 50 мільярдаў долараў, і толькі сёлета яна прафінансавала Беларусь на 2 мільярды.

Да таго ж аказваецца, што (цытую расійскага прэзідэнта) «усе мы — грамадзяне Саюзнай дзяржавы». Крый Бог, спадар Мядзведзеў, я такой дзяржавы не ведаю. Але ведаю, што ў нашай вельмі «вольна дыхае» толькі адзін прэзідэнт. А ў вашай?

Безумоўна, заява расійскага прэзідэнта выклікала зацікаўленасць у грамадзян абедзвюх пакуль што незалежных краін. Перш-наперш рэзкімі ацэнкамі паводзін свайго хаўрусніка «па інтэграцыі». Але што тычыцца праблемы зніклых, то нехта некалі слушна заўважыў — калі чалавек забойца, то мяне не цікавіць, што ён есць на абед. На працягу больш як 10 гадоў Лукашэнка не дазваляе правесці аб'ектыўнае расследаванне гэтых спраў. А з ім да гэтага часу і хлеб-соль дзялілі, і шампанскае пілі, і крышталны посуд аб крамлёўскі мармур білі.

Нас жа туды не клікалі, хоць крамлёўскі гаспадар па-ранейшаму лічыць, так выходзіць, беларусаў сваімі падданымі.

Дзе тут, як кажуць афіцыйныя апаненты аўтараў дысертацый, элементы навізны? Іх прага да Беларусі застаецца бязмежнай.

ЭКАЛОГІЯ

# БУДУЕМ ГОРЫ СМЕЦЦЯ

Вольга ХВОІН

**У Беларусі на ўзроўні дзяржавы рэалізуюцца праграмы па развіццю экалагічнага турызму. Аднак нявырашаным застаецца пытанне культуры людзей, якія адпачываюць на прыродзе. Дастаткова заехаць у лес ці на бераг вадаёму, каб пабачыць адыходы жыццядзейнасці чалавека, якія «ўпрыгожваюць» ландшафт. Са смеццем і неахайнымі турыстамі змагаюцца штрафамі. Але без развіцця адпаведнай культуры ў грамадстве, выхавання адказнасці за стан роднага краю адміністрацыйны рэсурс не здольны вырашыць экалагічныя хібы адпачынку і побытавага жыцця.**



Ігар Пастухоў, эксперт па экалагічнаму турызму

## Рэкрэацыйная нагрузка

У Беларусі прынята «Рэспубліканская стратэгія па ахове навакольнага асяроддзя да 2025 года». У 4-м раздзеле прапісана, што да 2014 года на рэспубліканскіх адмыслова ахоўваемых прыродных тэрыторыях неабходна правесці разлік аптымальнай рэкрэацыйнай нагрузкі. Канстатуецца, што беларускія азёры маюць высокі рэкрэацыйны патэнцыял, які варта развіваць. «Аднак, калі яго развіваць і калі рэкрэацыйная нагрузка будзе разлічаная неаб'ектыўна і завышана (як заўсёды робіцца па ўказцы выканкамаў і без удзелу незалежных экалагічных арганізацый), гэта прывядзе да таго, што дэградацыя нашай прыроды можа стаць больш відавочнай і незваротнай. Гэта будзе адбывацца і таму, што мы не маем паўнавартаснага фінансавання аховы адмыслова ахоўваемых прыродных тэрыторый, то бок заказнікаў», — выказвае заклапочанасць былы дырэктар заказніку «Сарачанскія азёры», эксперт па экалагічнаму турызму Ігар Пастухоў.

Паводле яго слоў, немагчыма забяспечыць паўнавартаснае развіццё экалагічнага турызму на адмыслова ахоўных прыродных тэрыторыях толькі аб'яднаўшы высілкі органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Да гэтага працэсу мусіць быць далучаная і грамадскасць.

Ігар Пастухоў з'яўляецца аўтарам прыгодніцкага і экалагічнага маршруту «Вецер Паазер'я» па тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцей. Напрыканцы лета экспедыцыя была спалучаная з экалагічнай акцыяй «Моладзь у абарону дзікай прыроды». Экалагічны дэсант з васьмі чалавек стартаваў з берага возера Вялікія Швакшты. Нягледзячы на тое, што тэрыторыя належыць Нацыянальнаму парку «Нарачанскі», эколагі адразу ж знайшлі побач з Малымі Швакштамі сметнік — адыходы на некалькі трактарных прычэпаў. Побач з ракой Страча на лясной палянцы валяліся бутэлькі, а недалёка стаялі адмысловыя скрыні для адыходаў. За тры дні экалагічнай акцыі яе ўдзельнікі прайшлі па тэрыторыі трох асабліва ахоўваемых тэрыторый і сабралі да 250 кілаграмаў смецця, выявілі і часткова ліквідавалі пяць сметнікаў.

«Вельмі шкада самаадданай працы некаторых працаўнікоў лясніцтваў і заказнікаў, якія спрабуюць прыбіраць даручаную тэрыторыю. Колькі б ні прыбіралі, а ўсё роўна знаходзіцца нямала прадстаўнікоў чалавецтва, якія не паважаюць ні прыроду, ні чужую працу. Бо за ўсімі не ўсочыш і за кожнай елкай інспектара не паставіш. Крыўдна глядзець на нядаўна прыбраную леснікамі стаянку, якая на наступны ж дзень зноў заплёваная і нават разламаная, як, напрыклад, альтанка на вадзе возера Кайменскае, — дзеліцца Ігар Пастухоў вынікамі экалагічнай акцыі. — Падчас ачысткі азёр трапляліся пакункі, датаваныя 2003 годам. А гэта значыць, што гэта смецце ніхто не прыбіраў з тых часоў, і, верагодна, яно праляжала б там яшчэ доўга, калі не вечна».

Калі інспектар Мінпрыроды злавіць за руку чалавека, што выкідае смецце, то за гэта можна атрымаць папярэджанне або штраф да 20 базавых велічынь. Але за забруджванне тэрыторыі прыцягнуць не так проста, бо трэба ўсё даказаць. Часцей супрацоўнікі лясгасаў штрафуюць турыстаў за развядзенне вогнішчаў. У Беларусі і цяпер дзейнічаюць правілы пажарнай бяспекі ў лясах, што ствараліся ў часы СССР. Паводле гэтага дакумента, забараняецца разводзіць вогнішчы пад кронамі дрэў, у месцах з падсохлай травой, на ўчастках лесу, пашкоджаных бураломам, на старых пажарышчах, у маладых лесапасадках. За парушэнне правілаў пажарнай бяспекі, калі не было матэрыяльнай шкоды, могуць пакараць папярэджаннем ці штрафам да 25 базавых велічынь. Калі вогнішча прывяло да знішчэння або пашкоджання лесу ці тарфянікаў, прадугледжаны штраф у памеры ад 25 да 50 базавых велічынь. Акрамя таго, вінаваты будзе абавязаны кампенсаваць нанесеную шкоду.

Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па праекце Дзяржаўнай праграмы развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгёна на 2011–2015 гады выказваўся за тое, каб да працэсу развіцця курортных зон краіны актыўна прыцягвалі замежныя інвестыцыі. Маўляў, каштоўнасць Беларусі ўжо вызначаецца, а далей тым больш будзе вызначацца не толькі нашым месцазнаходжаннем у цэнтры Еўропы, але і тым, што «такой чысціні ў свеце больш няма, калі браць прыроду ў комплексе». «Да нас могуць ездзіць не толькі адпачыць, але і аздаравіцца за кошт кантактаў з прыродай», — настаўляў чыноўнікаў, што працуюць у сферы турызму Аляксандр Лукашэнка.

Часам можна пачуць, што, калі ў зоны адпачынку са сваімі грашамі прыйдуць замежнікі, то яны прынясуць з сабой і культуру паводзінаў. Канешне, калі абгарадзіць возера плотам, зрабіць платны ўваход, паставіць сметніцы і наняць персанал, які будзе сачыць за парадкам, то гэта прынясе плён. Але развіццё такіх рэкрэацыйных тэрыторый vip-класу не прыйдзецца да спадобы большасці беларусаў, якія не прызвычаіліся плаціць за адпачынак у Беларусі.

Камерцыйны падыход не змяняе і стаўленне да навакольнага асяроддзя. Яскравая ілюстрацыя з жыцця: група турыстаў пасля трохдзённага сплаву па рэках, каб ехаць у Мінск, ідзе да станцыі цягніка з турыстычным начыннем (якое мае далёка не малую вагу) і пакункамі са смеццем, што сабралася за час паходу. У ляску маладыя людзі з мясцовых жыхароў са здзіўленнем пагляздзелі на транспарціроўку смецця і прапанавалі яго тут жа кінуць. То бок праблема не ў смеццевых скрынках, а ў галовах.

Дарэчы, урач-гігіеніст Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына Жэўняк заяўляла, што ў Беларусі плануецца ўзмацніць адміністрацыйную адказнасць за выкідванне смецця ў неналежным месцы. Ёсць і адпаведнае даручэнне Саўміна. «Цяпер гэта пытанне разглядаюць сумесна міністэрствы аховы здароўя, прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, МУС і іншыя», — расказала гэтым летам Ірына Жэўняк. Начальнік аддзела выкарыстання і аховы вод Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Таццяна Сліж растлумачыла, што размова ідзе пра дробнае смецце, якое па класіфікацыі не адносіцца да адыходаў. Па словах супрацоўніцы Мінпрыроды, самымі праблемнымі месцамі з'яўляюцца пляжы, прыпынкі, прыгарадныя і лесапаркавыя зоны.

## Грошы не пахнуць

Пад Мінскам лясы заваленыя будаўнічым смеццем. Эканомныя і гаспадарлівыя беларусы такім чынам самастойна вырашаюць праблему ўтылізацыі. За вываз і ўтылізацыю падобнага віду адыходаў трэба плаціць. Напрыклад, адна з прыватных фірмаў прапануе паслугі па вывазу смецця ў дыяпазоне ад 90 тысяч да 134 тысяч рублёў у залежнасці ад аб'ёму — 1,5 ці 5 тон трэба вывезці. Плюс трэба заплаціць за ўтылізацыю. У выніку пад горадам растуць несанкцыянаваныя сметнікі.

Утылізацыяй адыходаў заклапочаныя ўсе развітыя краіны. Напрыклад, у Германіі ці не ў кожнай кватэры сметніцы падзеленыя на сектары — пластык, папера, метал. Рэшткі ежы фасуюцца асобна яшчэ да таго, як яны трапяць на сметнік. Для шкла ёсць адмысловыя кантэйнеры. Тару адразу ж можна здаць у краме, калі набываеш піва ці ліманад. Раней у Беларусі было многа пунктаў прыёму другаснай сыравіны, шкляной тары. Цяпер здаваць на перапрацоўку макулатуру і бутэлькі не модна — адпаведна, і пунктаў прыёму другаснай сыравіны стала меней. Па інфармацыі ПУП «Мінскаапдругрэсурсы», у сталіцы, дзе пражывае каля двух мільёнаў чалавек, налічваецца 41 кропка прыёму другасных рэсурсаў.

Паводле артыкула 24 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адыходамі», каардынацыю дзейнасці па зборы другаснай сыравіны і эканамічна абгрунтаванаму яго выкарыстанню здзяйсняе адмыслова ўпаўнаважаная Саветам міністраў па ўзгадненні з кіраўніком Беларусі арганізацыя — дзяржаўнае гандлёва-вытворчае аб'яднанне «Белрэсурсы». У сталіцы цягам апошніх пару гадоў у дварах многіх дамоў з'явіліся кантэйнеры для паасобнага збору смецця, хаця жыхары сталіцы не налаўчыліся выкідваць пластык і паперу асобна. А перапрацоўчыя арганізацыі бяруць сартаваную другасную сыравіну, бо выкарыстоўваць пластык, які выкінулі ў кантэйнер разам з шалупіннем ад бульбы, складана, а калі гэта папера, кардон, то ўвогуле немагчыма.

Спецыялісты падлічылі, што кожны беларус пакідае пасля сябе штогод блізу трохсот кілаграмаў бытавога смецця. Перспектывы смеццевых гор побач з населенымі пунктамі не такія і цьмяныя. Тым больш, што ў Беларусі няма буйнамаштабных (з аб'ёмам больш за 200 тон цвёрдых адыходаў у год) заводаў па перапрацоўцы смецця. Эксперты мяркуюць, што краіна мае незасвоены і свабодны рынак перапрацоўкі цвёрдых бытавых адыходаў.

Напрыклад, бізнесмен Дзмітрый Кучук з'яўляецца ўласнікам прадпрыемства «Смеццесартавальная станцыя «Заходняя», і яго гадавы прыбытак, паводле падатковай дэкларацыі, перавышае 300 мільёнаў беларускіх рублёў. Праўда, даводзіцца працаваць з «санітарамі» горада і сметнікаў — бамжамі, але грошы не пахнуць. Магчыма, таму ў Беларусь паступова прыходзяць інвестары з Еўропы, якія не супраць зарабіць на тым, што валяецца пад нагамі.





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 11 КАСТРЫЧНІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010».
**09.10** «У цэнтры ўвагі».
**10.35** «Культурныя людзі».
**11.05** Серыял «Маруся» (Украіна).
**12.10** камедыя «Пажарны сабака» (ЗША).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Здароўе.
**16.30** Альманах вандраванняў.
**17.05** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.40** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.50, 01.10** «Зона Х».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** «Ход у адказ». Ток-шоў.
**21.00** Панарама. Інфармацыйны канал.
**21.55** Адмысловы рэпартаж «Мама. Не роля, а лёс».
**22.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША). 3-я серыя.
**23.25** Крымінальная камедыя «Матадор» (ЗША-Германія).
**01.15** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Дзікі маладняк».
**16.50** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Ток-шоў «Выбар».
**22.10** Прэм'ера. «Галасы».
**23.35** «Злодзеі ў законе».
**00.35** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Сакрэтныя гісторыі».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Заселеная выспа: Сутычка». Расія, 2009 г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Застанься». ЗША, 2005 г.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.05** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік.
**12.30** Пра мастацтва.
**13.00** Школа рамонту.
**13.55** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.50** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Тэлебарометр.
**15.25** Простыя практыкаванні (Расія).
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.45** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Атлант (Маскоўская вобласць). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** Авертайм.
**00.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Паўночнае ззянне Фёдара Абрамава». Дакументальны фільм.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** Тэлесерыял «Дворык».
**13.25** «Гарадок».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Пакой смеху».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**22.20** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.20** «Нічога асабістага».
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.05** Прэм'ера. «Паміж драмай і камедыяй. Ян Арлазораў». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.10** «Цуд-людзі».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.55** «Сумленны панядзелак».
**00.50** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.40** «Еўраспорт за чыстую планету».
**09.45** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**11.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**12.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Паўночная Ірландыя-Італія.
**12.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Ірландыя-Расія.
**13.15, 19.00, 01.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Агляд.
**14.15** Тэніс. Турнір WTA (Кітай). Фінал.
**15.30** Веласпорт. Велагонка «Тур Парыжу». Францыя.
**16.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Ірландыя-Расія.
**17.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Паўночная Ірландыя-Італія.
**18.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**20.00** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Ірландыя-Расія.
**21.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**00.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Паўночная Ірландыя-Італія.
**02.15** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**02.25** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Бітва з татарамі пад Альшаніцаю».
**07.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.55** ПраСвет.
**08.20** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак алею ды віна».
**08.45** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**09.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.15** Басанож па свеце: «Ізраэліты».
**09.45** Дакументальная гадзіна: «Я помнік сам сабе...», дак. фільм, 2009 г., Украіна.
**10.40** «Малая Масква», тэлесерыял.
**11.30** Фільматэка майстроў: «Ляціце на Расінанце», маст. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.30** «Малая Масква», тэлесерыял.
**18.20** Госць «Белсату».
**18.35** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.15** Калыханка для самых маленькіх.
**19.30** Еўропа сёння.
**19.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Удзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**21.45** Фільматэка майстроў: «Ляціце на Расінанце», маст. фільм, 2007 г., Балгарыя.
**23.10** Аб'ектыў.

## 12 КАСТРЫЧНІКА, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**10.00** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.35** Серыял «Маруся» (Украіна).
**11.25** Відэафільм АТН «Летапіс Жыткавіч» цыклу «Зямля беларуская».
**11.40** Адмысловы рэпартаж «Мама. Не роля, а лёс».
**12.10** Меладрама «Груды і раўніны».
**14.05** «Ход у адказ» Ток-шоў.
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Аўташкола.
**16.40** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010».
**17.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**17.50** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.50, 01.05** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрэсаў».
**19.55** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Камедыйны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-5» (ЗША). 4-я серыя.
**23.15** Прэм'ера. Спартовая камедыя «Руда і Курсі» (ЗША-Мексіка).
**01.10** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.00, 23.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 23.45** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.20** АНТ прадстаўляе: Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Беларусь - Албанія. Прамая трансляцыя.
**22.25** «Уцёкі».
**23.50** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.25** «Яўлампія Раманава. Следства вядзе дылетант». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.00** Фільм «Заселеная выспа: Сутычка». Расія, 2009 г.
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Жорсткі бізнэс». Серыял.
**21.25** Прэм'ера! «Пяць хвілін».
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** Прэм'ера! «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.55** Прэм'ера! «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.45** Камедыя «Маленькія бегляткі».
**12.15** Авертайм.
**12.50** «Запал па культуры».
**13.30** Меладраматычны серыял «Пакахай мяне зноў» (Мексіка).
**14.30** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**16.20** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**17.25** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Плэй-оф. Беларусь-Італія. Прамая трансляцыя.
**19.25** Камедыя «Тыя, што не паддаюцца».
**21.00** Калыханка.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** Беларуская часіна.
**22.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.05** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.40** «Спорт-кадр».
**00.10** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**10.10** «Старыя рускія бабкі». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** Тэлесерыял «Дворык».
**12.20** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**22.20** Навіны - Беларусь.
**22.30** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Пажар у гасцініцы «Расія». Дакументальны фільм.

### НТВ

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Рускія сенсацыі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.25** «Жаночы погляд».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Братва».
**15.10** «Жывуць жа людзі!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.55** Прэм'ера. «Капітал.ru».
**00.45** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**09.35** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**10.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Паўночная Ірландыя-Італія.
**11.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Ірландыя-Расія.
**11.45** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**12.00** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**13.30** Веласпорт. Велагонка «Тур Парыжу». Францыя.
**15.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Партугалія-Данія.
**16.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Паўночная Ірландыя-Італія.
**16.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Ірландыя-Расія.
**17.15, 00.00** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Агляд.
**18.15** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**18.30** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).
**20.00** Вось дык так!!!
**20.50** Футбол. Эўра-2012. Навіны.
**21.00** Бокс.
**22.00** Бокс.
**01.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно. Барселона (Іспанія). Агляд.
**01.30** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні. Канкур. Фінал. Кентукі (ЗША).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Еўропа сёння.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.10** Прыватная калекцыя.
**08.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Удзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**09.30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**09.50** Невядомая Беларусь: «Двое на Лысай гары», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**10.20** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**10.45** «Палкоўнік Квяткоўскі», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Машына зменаў», тэлесерыял.
**17.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 6 серыя.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Бітва з татарамі пад Альшаніцаю».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Праект «Будучыня» (паўтор).
**20.05** ПраСвет.
**20.35** Вагон.
**20.40** Хто ёсць кім?: Анатоль Міхайлаў – філосаф у выгнанні.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Асабісты капітал.
**21.40** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну», 2007 г.
**22.30** Рэпартэр.
**23.00** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**23.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 15 КАСТРЫЧНІКА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.05** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.15** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія). 3-я серыя.
**10.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**10.45** Серыял «Маруся» (Украіна).
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.10** Меладрама «Калі на поўдзень паляцяць жураўлі» (Украіна). 2-я серыя.
**14.05** «Школа доктара Камароўскага» .
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «Патрабуецца».
**16.05** Прэм'ера. Дакументальны цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**18.05** Серыял «Маруся» (Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія). 4-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.55** Крымінальная камедыя «Дрэнны добры паліцыянт» (Канада).
**00.20** Дакументальны цыкл «Зброя будучыні» (Вялікабрытанія).
**01.10** Дакументальны цыкл «У пошуках ісціны» (Украіна).
**01.55** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.15** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Шалёны анёл». Шматсер. фільм.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі». Восеньская серыя гульняў.
**22.35** «Дэтэктар хлусні».
**23.40** «Наша Белараша».
**00.15** Фільм «Забароненае царства».
**02.05** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Жорсткі бізнэс». Серыял. Заключная серыя.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** Прэм'ера. «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Прэм'ера! Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вяртанне высокага бландына». Францыя, 1974 г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Выспа страчаных душ». Германія - Данія - Швецыя, 2007 г.
**02.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Камедыйная меладрама «Формула кахання» (СССР).
**12.15** Час футболу.
**12.45** Кінаспробы.
**13.00** Гаспадар.
**13.30** Жывы гук.
**14.10** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.20** Дэтэктыўная камедыя «Людзі Шпака» (Расія).
**17.20** Усё аб бяспецы.
**17.50** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск)-Поўначсталь (Чарапавец). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.45** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**РОССИЯ**

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Дворык».
**12.05** Тэлесерыял «Лёсу загадкавае заўтра».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.20** Прэм'ера. «Сапраўднае жыццё».
**16.10** «Формула кахання». Ток-шоў.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Кулагін і партнёры».
**18.00** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** Прэм'ера. «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Карабель лёсу». Канцэрт.
**22.45** Навіны - Беларусь.
**22.55** Прэм'ера. «Дзяўчаты».
**23.30** Фільм «Ніколі не размаўляйце з невядомымі».

**НТВ**

**05.55** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.30** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «І зноў добры дзень!».
**11.15** «Бітва за Поўнач».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Прыгодніцкі серыял «Граф Крастоўскі».
**15.05** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Гарэлка: гісторыя ўсерасійскага пахмелля».
**22.40** «Нтвшнікі».

**EUROSPORT**

**09.30** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**09.35** Весь дык так!!!
**09.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Нідэрланды-Швецыя.
**10.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя-Уэльс.
**11.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**12.15** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/8 фіналу.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/4 фіналу.
**17.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Швейцарыя-Уэльс.
**18.30** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Нідэрланды-Швецыя.
**19.15** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Боўлінг. Тур PBA. ЗША. Часопіс.
**21.15** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Сербія.
**22.15** Гонкі на колавых трактарах. Чэмпіянат Еўропы. Швецыя.
**22.45** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.45** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**00.45** Футбол. Адборачны турнір Эўра-2012. Нідэрланды-Швецыя.
**01.30** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/4 фіналу.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Сальда (эканамічная праграма).
**08.05** Без рэтушы: «Тры кіламетры да неба», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**08.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Жыццё цудоўнае», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**09.20** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Ізраэліты».
**09.45** Беларусы ў Польшчы.
**10.00** «Зорны пірат», тэлесерыял.
**10.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 2 серыя.
**11.15** «Фальшывамалетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 10 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Чароўнае дрэва», серыял.
**17.30** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 2 серыя.
**18.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «У дзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**19.10** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Як Грэцыя і Партугалія сталі вялікімі турыстычнымі краінамі».
**19.25** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.05** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну», 2007 г.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**22.10** «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Гады».
**00.00** Аб'ектыў.

## 16 КАСТРЫЧНІКА, СУБОТА

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Асабнякі, дзе вяршылася гісторыя» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.40** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.10** «Аўташкола».
**11.10** Дакументальны цыкл «Невядомая версія (Украіна).
**12.10** Лірычная камедыя «Самотным даецца інтэрнат» (СССР).
**13.55** Хакей для ўсіх.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак». Інфармацыйна-аналітычная перадача.
**16.45** Nota Bene.
**17.10** Дакументальны серыял «Гараджане: Дака» (Бангладэш).
**17.40** Відэафільм АТН «Бяроза - дрэва гаючасці» цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.50** Псіхалагічная драма «Забароненае каханне» (Вялікабрытанія).
**23.55** Дзень спорту.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Разумніцы і разумнікі».
**11.55** «Залатая калекцыя «Беларусьфільма».
**12.25** «Дзяржаўная мяжа. Мы наш, мы новы...». Мастацкі фільм.
**15.00** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Хвіліна славы». Працяг.
**17.20** «Тур дэ Франс».
**18.15** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**19.15** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка-5».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Музычны фэст.
**23.35** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.10** «Што? Дзе? Калі?».
**01.25** Меладрама «Ледзяная нявеста».

**06.30** «Анфас».
**06.45** «Сямейнае кіно»: «Румпельштыльцхен». Германія, 2007 г.
**08.10** Фільм «Вяртанне высокага бландына». Францыя, 1974 г.
**09.35** Прэм'ера! «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Мачаха». СССР, 1973 г.
**15.30** «Дарагая перадача».
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Вялікі горад».
**17.30** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «Дынама» (Брэст) - «Нёман» (Гродна). Прамая трансляцыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Майкл Клейтан». ЗША, 2007 г.
**23.40** Фільм «Фантан». ЗША, 2006 г.
**01.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.35** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.05** Усё аб бяспецы.
**08.30** Нашы тэсты.
**09.40** «Рэальны свет».
**10.15** Жансавет.
**11.00** Тэлебарометр.
**11.05** «Запал па культуры».
**11.45** «Тыдзень моды ў Беларусі». Адкрыццё Belorussian Fashion Week.
**17.15** Прэм'ера. Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША). 1-я серыя.
**18.15** Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.20** Тэлебарометр.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Астан Віла-Чэлсі. Прамая трансляцыя.
**21.25** Джэймс Бонд-Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія).
**23.40** Жывы гук.

**РОССИЯ**

**07.00** Фільм «Вячэрні варыянт».
**08.30** «Карабель лёсу». Канцэрт.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Ніколі не размаўляйце з невядомымі».
**13.20** «Нататкі натураліста».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Уся Расія».
**14.30** «Мая планета».
**14.50** Фільм «Два квіткі на дзённы сеанс».
**16.40** «Пакой смеху».
**18.05** «Суботні вечар».
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Не зракаюцца кахаючы...».
**23.55** Фільм «Дом, у якім я жыву».

**НТВ**

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.15** Прыгодніцкая фантастыка «Вандраванне да цэнтра Зямлі».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Справа цёмная».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Рускія сенсацыі».
**22.15** «Ты не паверыш!».
**23.15** Прэм'ера. Крымінальная драма «Пятля».
**00.55** Дэтэктыўны трылер «Камера катаванняў».

**EUROSPORT**

**09.35** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/4 фіналу.
**11.00** Весь дык так!!!
**12.00** Ралі. Ралійная серыя IRC (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 1.
**12.55** «Алімпійскія гульні. Лондан». Часопіс.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/4 фіналу.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/2 фіналу.
**16.45** Веласпорт. Тур Ламбардыі. Італія.
**18.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 1.
**19.30** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/2 фіналу.
**20.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**21.30** Кікбоксінг. Сусветная серыя. Амстэрдам (Нідэрланды).
**23.30** Весь дык так!!!
**00.30** Веласпорт. Тур Ламбардыі. Італія.
**02.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 1.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**08.35** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Як Грэцыя і Партугалія сталі вялікімі турыстычнымі краінамі».
**08.45** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «У дзень кірмашу», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**09.50** «Чароўнае дрэва», серыял: 6 серыя.
**10.20** Калыханка для самых маленькіх.
**11.00** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: 6 серыя: «За Бога, цара і Айчыну», 2007 г.
**11.55** «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял: 6 серыя.
**18.05** Незвычайнае жыццё, звычайны людзі: «Георгі і матылі», дак. фільм, 2004 г., Балгарыя.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.20** Моўнік (лінгвістычная праграма) (паўтор).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 1.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Адвага кахаць», маст. фільм, 2005 г., Францыя.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Заклад».
**23.05** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 17 КАСТРЫЧНІКА, НЯДЗЕЛЯ

**[1]**

**08.05** Дзень спорту.
**08.15** Пазнавальны серыял «Чалавек супраць дзікай прыроды» (ЗША-Вялікабрытанія).
**09.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Альманах вандраванняў».
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** Культурныя людзі.
**11.20** «Школа доктара Камароўскага».
**12.00** Навіны.
**12.15** Камедыя «Беражыся аўтамабіля» (СССР).
**14.05** «Кінашок» па-беларуску».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.00** Навіны.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дзённік Міжнароднага дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010».
**16.05** Меладрама «Кука» (Расія).
**18.05** Суперлато.
**19.00** Навіны.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.00** Меладрама «Восень у Нью-Йорку» (ЗША).

**[ОНТ]**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Ранішняя пошта».
**12.25** «Шчасце ёсць!».
**13.15** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.45** Прэм'ера. «Мой сын - Андрэй Краско».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся».
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.45** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера сезону. «Лёд і полымя». Працяг.
**23.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Ольбарг» - «Дынама-Мінск».
**01.05** Камедыя «Не заракайся!».

**[СТВ]**

**06.05** «Сямейнае кіно»: «Кароль-жабяня». Германія, 2008 г.
**07.05** Фільм «Майкл Клейтан». ЗША, 2007 г.
**09.00** Прэм'ера! СТБ прадстаўляе: «Кажа і паказвае Мінск». Радыё ONline.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.50** Фільм «Выйсці замуж за капітана». СССР, 1985 г.
**15.30** «Дарагая перадача».
**15.40** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтэрас».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Ахоўнік». ЗША, 2006 г.
**22.40** Фільм «Кікуджыра». Японія, 1999 г.
**00.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**[ЛАД]**

**07.45** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.50** Нашы тэсты.
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Бухта капітанаў.
**11.20** «Правы чалавека».
**11.40** Тэлебарометр.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** «Тыдзень моды ў Беларусі». Закрыццё Belorussian Fashion Week.
**16.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Эвертан-Ліверпуль.
**18.45** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-3» (ЗША). 2-я серыя.
**19.40** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**20.45** Тэлебарометр.
**21.05** Джэймс Бонд-Агент 007. Баявік (Вялікабрытанія).
**23.20** Культасвет.
**23.50** Авантурная меладрама «Кіпень» (Расія).

**[РОССИЯ]**

**07.00** «Гарадок».
**07.50** Фільм «Не зракаюцца кахаючы...».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Эдгар і Крысціна».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** Фільм «Круг».
**16.30** «Канцэрт Крысціны Арбакайтэ».
**18.10** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Адмысловы карэспандэнт».
**21.30** Фільм «Гувернантка». 2009 г.
**23.30** Фільм «Апошні загад генерала».
**01.10** «Алег Янкоўскі. Pieta».

**[НТВ]**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.50** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Праспявана ў СССР».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Бітва за Поўнач. «1937».
**14.20** «Суд прысяжных: Галоўная справа».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Развод па-руску. Зверскі бізнэс».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. «Марскія д'яблы. Лёсы».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.35** «Футбольная ноч».
**01.05** «Нерэальная палітыка».

**[EUROSPORT]**

**09.30** Веласпорт. Тур Ламбарды. Італія.
**10.30** Вось дык так!!!
**10.45** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). 1/2 фіналу.
**12.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**13.00** Аўтаспорт. Гонкі ў класе Турынг. Кубак Еўропы. Адрыя (Італія). Гонка 1.
**13.30** Веласпорт. Тур Ламбарды. Італія.
**14.15** Аўтаспорт. Гонкі ў класе Турынг. Кубак Еўропы. Адрыя (Італія). Гонка 2.
**14.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**16.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Фінал.
**17.30** Вось дык так!!!
**18.30** Веласпорт. Тур Ламбарды. Італія.
**19.45** Вось дык так!!!
**20.00** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Фінал.
**21.30** Бокс.
**23.30** Мотаспартыўны часопіс.
**23.45** Ралі. Ралійная серыя IRC. Абердзін (Шатландыя/Вялікабрытанія). Дзень 2.
**00.45** Тэніс. Турнір WTA. Лінц (Аўстрыя). Фінал.
**02.15** Мотаспартыўны часопіс.

**[БЕЛСАТ tv BELSAT]**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**08.10** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Кім быў Кірыла Тураўскі?»
**08.15** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**08.25** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 1.
**08.50** Незвычайнае жыццё, звычайныя людзі: «Георгі і матылі», дак. фільм, 2004 г., Балгарыя.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.55** Калыханка для самых маленькіх.
**10.25** «Арол: крымінальная сага», серыял: 6 серыя.
**11.25** «Адвага кахаць», маст. фільм, 2005 г., Францыя.
**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**17.45** «Малая Масква», тэлесерыял: 3 серыя.
**18.35** Дакументальная гадзіна: «Рэнэ», дак. фільм, 2009 г., Чэхія.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**20.05** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): «Новая Гвінея, 1969», ч. 2.
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча: «Смак Кастыліі».
**21.55** Фільматэка майстроў: «Дом дурняў», драма, 2002 г., Расія.
**23.40** Тыдзень у «Аб'ектыве».

---

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на любую кольскасць месяцаў праз пошту або праз банк. Нашы рэквізіты: нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і пропісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі абавязкова накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ______

Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СПРАВА НРА

Алег НОВІКАЎ

**У Беларусі працягваюцца ператрусы і арышты па справе спробы падпалу расійскай амбасады, адказнасць за які ўзяла на сябе групоўка «Сябры свабоды». У тым, што зараз адбываецца, ёсць пэўная аналогія са справай «Новай рэвалюцыйнай альтэрнатывы» (НРА) — арганізацыі, якая быццам здзейсніла шэраг тэрактаў у Расіі напрыканцы 1990-х гадоў.**

1996 год. Ужо амаль два гады ішла першая чачэнская вайна. Чарговы восеньскі прызыў. Зноў у калідорах ваенкаматаў — шэрагі напаўголых хлопцаў, зноў там вырашалася, хто атрымае ад радзімы шанец на рэалізацыю святога права напоўніць спісы забітых. На карнізе аднаго з ваенкаматаў Масквы спрацавала самаробная выбуховая прылада. Запальная бомба павінна была выклікаць начны пажар у памяшканні, дзе захоўваліся справы рэкрутаў, але шкоды Міністэрству абароны нанесена не было.

У прэсе з'явіліся спасылкі на невядомую раней «Новую рэвалюцыйную альтэрнатыву», якая ў сваёй заяве абуралася чачэнскай вайной. Аналіз тэксту дазволіў аднесці яе аўтараў да актывістаў радыкальнага левага спектру.

На працягу года адбылося яшчэ некалькі інцыдэнтаў — каністра з бензінам падарвалася побач з офісам Федэрацыі прафсаюзаў, каля будынку Галоўнай ваеннай пракуратуры знойдзена самапальная бомба. Паўсюль той жа подпіс — НРА. Кампетэнтнымі органамі заведзены справы, але пра вынікі расследавання нічога не паведамляецца.

Між тым, ранкам 22 красавіка 1997 года лідэр камуністаў Генадзь Зюганаў накіраваўся на Чырвоную плошчу, каб ускласці кветкі да Маўзалею. Раптам некалькі маладых панкаў закідалі Зюганава памідорамі за «здраду рэвалюцыйным ідэалам». Сярод арыштаваных быў Андрэй Сакалоў. Пасля выхаду з КПЗ, дзе хлопцаў трымалі некалькі дзён, ён вырашыў адпомсціць.

У ліпені 1997 года, у чарговыя ўгодкі расстрэлу царскай сям'і, на Ваганькаўскіх могілках у Маскве Андрэй здзейсніў падрыў мемарыяльнай пліты Раманавых. На сцяне Андрэй пакінуў надпіс: «Зарплату працоўным!» «Органы» падазрона хутка выйшлі на Сакалова і пасадзілі за вандалізм.

І тут у краіне пачалася своеасаблівая вайна з помнікамі. Правыя ў адказ на выхадку Сакалова пачалі пагражаць узарваць маўзалей і іншыя мемарыялы бальшавікоў. Левыя абяцалі пусціць у паветра помнікі ўсім царам. Перапалка на старонках прэсы хутка перайшла ў жыццё. У Маскве была закладзена міна пад помнік Пятру Першаму працы Цэрэтэлі. Адказнасць узяў нейкі Рэўваенсавет РСФСР.

І тут «органы» праявілі незвычайную аператыўнасць. Прайшла серыя арыштаў цалкам сталых палітыкаў са сталінскага лагера: самым вядомым з якіх быў «чырвоны капіталіст» Ігар Губкін. На іх павесілі тыя самыя «царскія» выбухі і адправілі ў Лефортава. Калі прайшлі ўсе магчымыя тэрміны папярэдняга зняволення, Губкін пачаў чакаць суда на волі. Грамадскасць не разумела, чаго марудзяць спецслужбы: здавалася — зачыняй справу, афармляй прысуд, атрымлівай узнагароды і новыя прызначэнні. Ці то доказаў замала і баяцца, што справа разваліцца ў судзе, ці рыхтуюць справу якога-небудзь «аб'яднанага тэрарыстычнага цэнтра»? Апошняя гіпотэза аказалася больш дакладнай.

У канцы лістапада 1998 года ў Краснадары за распіваннем віна нарад міліцыі застукаў групу валасатай моладзі. У 18-гадовага Генадзя Непшэкуева знайшлі ў рукзаку дзве «лімонкі». Падчас допыту Непшэкуеў прызнаўся ў падрыхтоўцы выбуху краявой адміністрацыі і намеры забіць тагачаснага губернатара Краснадарскага краю Мікалая Кандраценка. Па словах хлопца, дапамагаць яму павінна была нейкая Маша. У Машы ў Маскве была сяброўка Ларыса Шчыпцова, што займалася выпускам касет з запісамі рок-гуртоў, якія пасля прадавала. Ларыса аказалася сапраўдным падарункам для спецслужбаў. Па яе запісной кніжцы было здзейснена каля 20 ператрусаў і допытаў толькі ў расійскай сталіцы. Ларыса, па версіі «органаў», і была адным з ключавых рычагоў «міжнароднай змовы».

У выніку яе — 25-гадовую на той момант цяжарную жанчыну — пад аховай «Альфы» даставілі ў турму краснадарскага ФСБ. Аднак у выніку справа зноў развалілася. Шчыпцову пасадзілі не за тэрарызм, а за перавоз выбуховых рэчываў. На зоне яна нарадзіла дачку.

Напачатку верасня 1999 года прыйшла вестка пра падазроны акт гуманізму, здзейснены расійскай юстыцыяй — прэзідыум Краснадарскага краявога суда вынес рашэнне пра замену Ларысе чатырох гадоў зняволення на чатыры гады ўмоўна. Цікава, што яна ўспрыняла рашэнне не вельмі радасна.

«Па-мойму, гэтыя маньякі вышуку жадаюць выявіць мае «злачынныя сувязі», — казала Ларыса Шчыпцова ў інтэрв'ю адной з газет.

Ход прэзідэнцкай перадвыбарнай кампаніі, якая праходзіла пад кананадаю выбухаў тэрарыстаў, паказаў, што яна мела рацыю.

У ноч на 4 красавіка 1999 года ў Маскве ў прыёмнай ФСБ выбухнуў зарад, эквівалентны кілаграму траціла. Усе, хто прайшоў праз чараду ператрусаў і допытаў па «краснадарскай справе», вобразна кажучы, перахрысціліся. Выбух, па прызнанні «органаў», быў праведзены дасведчаным прафесіяналам. «Хоць гэта яны на нас не павесяць!» — уздыхнулі з палёгкай інтэлігенты і панкі.



Надзея Ракс, злева, і Ларыса Шчыпцова, справа, у 2003 г.




Але радаваліся рана. Раптам усплыла папера, дасланая на станцыю «Рэха Масквы». Зноў «Новая рэвалюцыйная альтэрнатыва»! Па факце выбуху была заведзена справа. Пуцін, тады яшчэ не прэзідэнт, даў слова знайсці і арыштаваць вінаватых.

І тут пачалося нешта фантастычнае. Паралельна пачатку баявых дзеянняў на Каўказе адбыўся сапраўдны выбух у падземнай краме на Манежнай плошчы. Версіі зноў дзве — ісламская і левацкая. Шукаюць НРА. Аднак тут на сцэне з'явіўся экзатычны пісьменнік Сяргей Піменаў, які адкрыта ўзяў на сябе адказнасць за выбух. Фігура Піменава настолькі смешная, што ставіць у тупік. Значна больш грамадства цяпер пачало турбаваць пытанне пра прафесіяналізм спецслужбаў, якія паспяшаліся раструбіць пра «новую вылазку левага тэрарызму». У выніку інцыдэнт на Манежнай быў у пажарным парадку інфармацыйна перакрыты выбухамі жылых дамоў у Маскве і Валгадонску. На гэтай хвалі Пуцін быў абраны прэзідэнтам.

Аднак справу пра выбух у офісе ФСБ трэба было зачыніць. І тут распачалася папросту камедыя. Спачатку на Лубянцы сказалі, што знайшлі тэрарыстаў, якія схаваліся ў Сібіры ў секце Вісарыёна. Аднак пасля ад гэтай версіі адмовіліся. Затое хутка ва ўласным пад'ездзе была арыштавана ўсё тая ж Ларыса Шчыпцова. Яе ўзялі за выбух у прыёмнай ФСБ, падчас якога, нагадаем, яна сядзела ў краснадарскай турме. На закуску арыштавалі Сакалова, калі ён выйшаў з дому, як гаворыцца ў дакументах следства, «з пісталетам і мяшком патронаў». У той вечар Андрэй, дарэчы, павінен быў выступаць на прэс-канферэнцыі.

Ларыса і Андрэй адсядзелі чарговыя тэрміны. Пасля гэтага пра левых тэрарыстаў у Расіі, дзякуй Богу, больш не ўзгадвалі.

«Калі верыць спецслужбам, прэзідэнту і СМІ, — кажа паліттолаг Уладзімір Тупікін (Масква), — Расія літаральна напоўнена тэрарыстамі. Дзе ж тады сур'ёзнае, на ўзроўні аналітыкі, а не крыкаў, інфармацыйнае процідзеянне пагрозе? Чаму па тэлевізары не выступаюць сур'ёзныя навукоўцы, якія даказваюць бесперспектыўнасць тэрарызму з разнастайных пазіцый — з палітычнай, філасофскай, маральнай, з пункту гледжання асабістых лёсаў тэрарыстаў і іх асяроддзя? Чаму не змагаюцца яны за розумы маладых? Ці не жадае «хтосьці», каб не атрымалі шырокую агалоску факты, як маніпулявалі тэрарыстамі спецслужбы — і не толькі «чужыя», але і «свае»? Ці, наогул, гэты «хтосьці» не жадае прадухіляць новую, сапраўдную хвалю тэрарызму? Тэрарызм — гэта ж выдатная нагода для ўзмацнення жорсткасці рэжыму, для ліквідацыі грамадзянскіх правоў, свабоднай прэсы, для ператварэння банальнага недэмакратычнага рэжыму, якім з'яўляецца рэжым Пуціна, у сапраўдную дыктатуру. Не факт, што зацікаўлены ў гэтым сам Пуцін. Але вось «пэўныя кругі»… Можна іх нават і вызначыць пры жаданні, але гэта тэма для асобнага артыкула».

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларускаму «цуду» прыйшоў канец. Цяперашняя сітуацыя для Беларусі пагражае скачком коштаў, падзеннем узроўню жыцця і ўсімі іншымі аспектамі дзікага капіталізму з бандытамі, закладнымі аўкцыёнамі і масавай эміграцыяй беларусаў. Лукашэнка мае толькі два выйсця. Ці правесці маштабную прыватызацыю беларускіх дзяржаўных прадпрыемстваў пры ўдзеле заходніх карпарацый — і тады абавязкова давядзецца вярнуць свабоду прэсы, вольныя выбары і адказаць на шэраг непрыемных пытанняў. Ці дазволіць прыватызаваць маёмасць расіянам па танных коштах. А гэта будзе азначаць страту Мінскам сваёй незалежнасці. У цяперашнім свеце дазволіць сабе «цуды» могуць толькі дзяржавы з магутнай эканомікай і надзейнымі рынкамі збыту. «Цуды» ж, пабудаваныя дзякуючы чужым фінансавым датацыям, лёгка могуць быць разбураныя як эканамічным крызісам, так і свядомымі дзеяннямі тых, хто «інвеставаў» у такія праекты. Прыклад Беларусі даказвае: калі ўтрыманец становіцца непатрэбным, Крэмль пазбаўляецца ад яго без шкадавання.

**«Український Тиждень» (Украіна)**

Па вялікаму рахунку, цяпер, перад выбарамі, зразумела, што выйграе іх Лукашэнка. Але перад Лукашэнкам стаіць вельмі сур'ёзная праблема легітымізацыі гэтых выбараў. Раней было ўсё проста — Захад выбары не прызнаваў, прызнала Расія і СНД, і Лукашэнку гэтага хапала. А што будзе, калі выбары не прызнае ніхто — ні Захад, ні СНД, у тым ліку і Расія? Улічваючы гэтыя акалічнасці, Лукашэнку не трэба ісці на абвастрэнне адносін з Масквой.

**«BBC» (Вялікабрытанія)**

«Я б прагаласаваў за іншага кандыдата, але яго няма», — з ціхай роспаччу сказаў мне адзін з працоўных на МАЗе. І гэта сапраўды так — палітычная «паляна» ў Беларусі зачышчана да поўнага бляску, як любая з плошчаў Мінска. Вядома, сам Лукашэнка, кажучы пра «восем сотняў, здольных у адкрытую супрацьстаяць уладзе на мітынгах», моцна згушчаў фарбы. Супернікаў усярэдзіне Беларусі ў яго больш, а тых, каму бацька папросту надакучыў, і зусім мора. Але, верагодна, гэтыя людзі пакінуць сваё меркаванне пры сабе і прагаласуюць «як трэба».

**«Невское время» (Расія)**

Развод Крамля і Лукашэнкі быў непазбежны. Зараз ён адбыўся. Пра гэта можна казаць з усёй пэўнасцю. Складана ўявіць сабе абдымкі Мядзведзева і Лукашэнкі. Нават поціск рукі складана ўявіць пасля такіх рэзкасцяў. Хто страціць больш ад такога разводу? Лукашэнка, вядома, быў адзіным саюзнікам Расіі. Але як ён «быў», так і Расія, для якой Мінск быў найважным саюзнікам, таксама ўжо «была». Гэта пройдзены этап, які б ні гучалі словы пра партнёрства ў саюзнай дзяржаве. Лукашэнка не зможа далучыцца да альтэрнатыўнага цэнтра сілы. Нікому з тых, хто тэарэтычна мог бы спансаваць беларускі рэжым, Лукашэнка не патрэбен. Ён пераможа на снежаньскіх выбарах. Але што далей?..

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ВЕНЕСУЭЛА. ЧАВЕС СТАНОВІЦЦА ТРАЦКІСТАМ

Заходнія спецыялісты, якія робяць маніторынг палітычных працэсаў у Венесуэле, пачалі казаць пра магчымы альянс Уга Чавеса і трацкістаў. Раман паміж імі пачаўся год таму, калі ў Каракасе на спецыяльным з'ездзе левых партый з усяго свету Чавес нечакана заклікаў да стварэння новага V Інтэрнацыянала. У Інтэрнацыянале Чавеса трацкісты адразу пабачылі ідэйную і праграмную пераемнасць з Чацвёртым інтэрнацыяналам, створаным Львом Троцкім у 1938 годзе. Акрамя таго, балівaрскі лідэр не раз падчас тэлевізійных выступаў называў сябе прыхільнікам «тэорыі перманентнай рэвалюцыі», якую прыдумаў Леў Давыдавіч. На згаданую сустрэчу ў Каракасе таксама быў запрошаны Усевалад Волкаў — унук Троцкага, які жыве ў Мексіцы. Аднак галоўным момантам пачатку сяброўства трацкістаў і Чавеса з'яўляецца канфлікт Уга з мясцовай кампартыяй, якая адмовілася ўступаць у створаную Чавесам Аб'яднаную сацыялістычную партыю Венесуэлы (PSUV), паколькі лічыць яе ідэйна аморфнай. Больш таго, лідэр камуністаў назваў Чавеса «дзіўнай птушкай, якая стаіць на трох лапах — ідэі Балівара, хрысціянстве і марксізме». У такой сітуацыі маргінальныя трацкісцкія групы маюць шанец пранікнуць у партыйныя структуры Чавеса. Па сваёй ідэйна-палітычнай падрыхтаванасці яны на галаву вышэй значнай часткі яе сярэдняга кіраўнічага звяна венесуэльскага рэжыму. Пакуль цяжка казаць, чым закончыцца гэты працэс. Як мінімум, тэарэтычная спадчына Троцкага будзе скарыстана Чавесам пры распрацоўцы статутных і праграмных дакументаў Інтэрнацыяналу. Як максімум — Чавес можа даць імпульс усяму трацкісцкаму руху ў свеце, стаўшы галоўным нашчадкам Льва Давідавіча.

**Па матэрыялах амерыканскай прэсы**

### ЗІМБАБВЕ. ЗАБАРОНЕНЫ РОК-ГУРТ



Улады Зімбабве пастанавілі забараніць тур рок-гурта «Freshlyground» з Паўднёвай Афрыкі. Таксама ўсім каналам тэлебачання і радыёстанцыям забаронена трансляваць песні гурта. «Freshlyground» даволі папулярны ў рэгіёне калектыў. Дастаткова сказаць, што ягоныя музыканты дапамаглі спяваччы Шакіры выканаць гімн апошняга чэмпіянату свету па футболе. Прычынай забароны калектыву ў Зімбабве, відавочна, стала апошняя песня «Chicken to Change», галоўны герой якой дыктатар Роберт Мугабэ. Увогуле, забароны «Freshlyground» трэба было чакаць даўно. У 2008 годзе, падчас прэзідэнцкіх выбараў у Зімбабве, гурт выступаў на мітынгах галоўнага кандыдата апазіцыі Моргана Тсвангіраі, які перамог Мугабэ ў першым туры. Другога туру не адбылося з-за таго, што лідэр апазіцыі зняў кандыдатуру на знак пратэсту супраць паліцэйскага ціску на сваіх актывістаў. Пасля гэтага «Freshlyground» хацелі абвесціць Зімбабве байкот, аднак Мугабэ, здаецца, іх апярэдзіў.

**Па матэрыялах «Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

### МАЛДОВА. ВУЛІЦА Ў ГОНАР АНТАНЕСКУ

У Малдове з'явілася першая вуліца, якая названая ў гонар Іона Антанеску — румынскага вайскоўца і дыктатара, які ў часы другой сусветнай вайны стаяў на баку Берліна і амаль цалкам знішчыў яўрэйскае насельніцтва Малдовы. Тым не менш, некаторыя малдаўскія палітыкі гатовыя прабачыць генералу ўсе згаданыя ўчынкі за тое, што ён хоць на некаторы час вярнуў Малдову ў склад Румыніі. Нагадаем, што ў 1940 годзе ў рамках дамовы Молатава — Рыбентропа частка Румыніі стала Малдаўскай ССР. У цяперашняй Малдове цягнуцца спрэчкі пра ролю Антанеску ў гісторыі краіны. Прыхільнікі уніі Малдовы з Румыніяй заклікаюць ушанаваць яго імя, нават абвесціць героем Малдовы. Працiўнікі рашуча супраць. Так ці інакш, першая вуліца імя Іона Антанеску — ужо факт. Яна, праўда, знаходзіцца не ў буйным горадзе, а ў маленькай вёсцы Кудру. Цікава, што мясцовыя ўлады, якія прынялі рашэнне пра перайменаванне вуліцы, кажуць, што ніякай палітыкі тут няма. Папросту ў 1930–1940-я гады тут знаходзілася віла Антанеску. З тых часоў мясцовыя называюць вуліцу, на якой яна стаяла, вуліцай Антанеску. Улады такім чынам толькі замацавалі тое, што даўно стала тапанімічнай нормай.

**Па матэрыялах «Новай газеты» (Малдова)**

ЦІКАВА



# БЫВАЙЦЕ, СЭР ПІТКІН!

**Іван БІЧ**

**4 кастрычніка на 96-м годзе жыцця ў доме састарэлых на востраве Мэн у Вялікабрытаніі памёр Норман Уіздам, камічны акцёр, які выканаў ролю славутага містэра Піткіна. Пры жыцці яго лічылі самым смешным комікам у свеце пасля Чарлі Чапліна.**

Мала хто ведае, што да выхаду на экраны серыялу пра Джэймса Бонда, менавіта Піткін, а не агент 007 быў вобразам Вялікабрытаніі. Больш таго, геаграфія папулярнасці Нормана Уіздама была значна шырэйшай за героя раманаў Яна Флемінга. У краінах Усходняга блоку фільмы пра Бонда лічыліся прадуктам імперыялістычнай прапаганды і, адпаведна, былі пад забаронай. А вось грымасы і пантамімы Піткіна цэнзары палічылі чамусьці нейтральнымі для справы марксізму-ленінізму. Больш таго, некаторыя савецкія кінакрытыкі сцвярджалі, што прыгоды Піткіна на экране ілюструюць, як цяжка ў класавым грамадстве тым, хто не належыць да істэблішменту.

У выніку амаль усе фільмы пра Піткіна былі паказаныя ў кінатэатрах Усходняй Еўропы. У СССР, дарэчы, Піткіна агучваў Георгій Віцын. А ў Албаніі Піткін нават стаў нацыянальным героем дзякуючы мясцоваму дыктатару Энверу Ходжа. Энвер быў заўзятым фанатам Нормана Уіздама, таму фільмы з яго ўдзелам паказвалі ў Албаніі вельмі часта. Іншых заходніх акцёраў албанцы да краху камунізму ўвогуле не ведалі. Не дзіўна, што пасля падзення Берлінскай сцяны, калі Норман прыехаў у Албанію, яго сустракалі як мега-зорку. На цэнтральнай плошчы Цiраны, сталіцы краіны, каб паглядзець на госця, сабраўся шматтысячны натоўп. Акцёра вітаў асабіста прэзідэнт дзяржавы. Сам Норман быў вельмі здзіўлены. На той час ягоныя фільмы паказвалі хіба што ў рубрыцы «настальгія».

Кульмінацыя папулярнасці Піткіна выпала на мяжу 1950–60-х гадоў. Лічыцца, што на стварэнне вобразу Піткіна Нормана падштурхнуў сам Чарлі Чаплін. Абодва акцёры сустрэліся ў 1950 годзе. Чаплін прапанаваў Норману стварыць свайго сталага экраннага персанажа.

Уіздам не быў навічком у гэтай справе. Яго дэбют у кіно адбыўся ў 1948 годзе. Раней ён прайшоў цікавы жыццёвы шлях. Хлопчыку, народжанаму ў сям'і алкаголікаў у 1915 годзе, давялося рана пайсці з хаты і зарабляць самому на жыццё. Адначасова Норман хапаўся за ўсё што можна: займаўся боксам, служыў маракам, працаваў аператарам тэлефоннай станцыі, быў афіцыянтам і музыкам.

Калі пачалася другая сусветная вайна, Уіздама накіравалі служыць у сувязь. У вайсковай частцы ён пачаў, як бы ў нас сказалі, удзельнічаць у творчай самадзейнасці. Пасля вайны Норман чамусьці вырашыў заняцца акцёрскай справай. Тры тыдні ён хадзіў па акцёрскіх агентах Лондана, пакуль не падпісаў першы кантракт. І адразу пачаў развіваць свой вобраз — правінцыйнага ідыёта, які ўступае ў канфлікт з усімі прадметамі навокал: ад дзвярэй да ўласнага ценю.

Норман адразу спадабаўся аўдыторыі. На адным з першых шоу нейкая дзяўчына ў зале смяялася так моцна, што вывіхнула сабе скіўцу. Праз два гады Норман стаў зоркай мюзік-хола і гастраляваў па краіне. У дадатак ён быў адным з самых улюбёных комікаў каралеўскай сям'і. Яго часта запрашалі выступаць перад каралеўскім дваром.

Праз тры гады пасля сустрэчы з Чаплінам Норман сапраўды зрабіў першы фільм «Trouble in Store». Стужка была вельмі прахалодна сустрэтая крытыкамі, аднак не гледачамі. «Trouble in Store» імкліва праравуўся ў дзесятку самых папулярных фільмаў года. Невераготна, аднак Норман Уіздам са сваімі камедыямі пра Піткіна змог пратрымацца на вяршыні папулярнасці аж да 1966 года. Адначасова ён працягваў працаваць на тэлебачанні, паставіўшы задачу — рабіць адзін скетч на тыдзень. Яго шоў на тэлебачанні таксама карысталася папулярнасцю. У 1964 годзе 18 мільёнаў брытанцаў глядзелі пародыю Нормана Уіздама на Рабінзона Круза.

У 1966 годзе з'яўленне Джэймса Бонда вызначыла цалкам новы фармат брытанскага кіно. Хутчэй нават, пахавала старую брытанскую індустрыю, паколькі фільмы кшталту прыгодаў Джэймса Бонда можна здымаць выключна ў Галівудзе. Моладзь — асноўны глядач — патрабавала нейкага цынічнага і адначасова «крутога» героя. А дурань містэр Піткін яўна не пасаваў такому крытэру.

На момант заканчэння працы над Піткіным Норман Уіздам быў вельмі заможным чалавекам. Цікава, што Піткін у пракаце сабраў больш грошай за Бонда. Норман Уіздам калекцыянаваў машыны, меў вялікую яхту і жыў на арыстакратычнай віле. Аднак хутка фартуна здрадзіла яму. Спачатку ад яго сышла жонка з двума дзяцьмі. Пасля ён быў вымушаны заплаціць 200 тысяч фунтаў за тое, што не ў свой час сплаціў падаткі. Пасля гэтай гісторыі Норман пачаў весці больш сціплы лад жыцця.

Нягледзячы на ўсе праблемы, нават будучы старым чалавекам, ён працягваў гастраляваць і здымаўся ў кіно. У 2008 годзе ён апошні раз з'явіўся на экране ў адным з серыялаў.

У 2000 годзе Уіздам атрымаў рыцарскі тытул за ўклад у брытанскую кінематаграфічную індустрыю.

Норман Уіздам увойдзе ў гісторыю таксама як актор, які здолеў памерці двойчы. 28 снежня 2008 года «Sky News» абвясціла, што Норман Уіздам памёр, прадставіўшы загадзя напісаны некралог. Пра смерць коміка таксама абвясцілі некаторыя тэлевізійныя каналы і напісалі на шматлікіх вэб-сайтах. Неўзабаве, калі стала відавочна, што іншыя крыніцы нічога пра смерць Нормана не ведаюць, «Sky News» хуценька прыбрала некралог, заявіўшы, што гэта было выдадзена па памылцы ў адказ на пытанні ў e-mail.

Навіна пра смерць Нормана ад 4 кастрычніка 2010 года, на жаль, аказалася праўдай.

МЕРКАВАННЕ

# ГЭТЬ КУЧМУ–2

**30 верасня ва Украіне адбыўся фактычна канстытуцыйны пераварот — з парламенцка-прэзідэнцкай (галоўнае дасягненне «аранжавай» рэвалюцыі) дзяржава стала зноў прэзідэнцкай. Што значаць такія змены для «аранжавай» апазіцыі? На гэта і іншыя пытанні журналіста «НЧ» Алега Новікава адказвае кіеўскі палітолаг Юрый Дакукін.**




**Даведка:**

30 верасня 17 з 18 суддзяў Канстытуцыйнага суда прызналі папраўкі ў тэкст Канстытуцыі Украіны, унесеныя ў рамках так званай палітрэформы 2004 года, незаконнымі. У выніку ў краіне ўстанаўліваецца папярэдняя дзяржаўная мадэль — прэзідэнцкая рэспубліка. Гэта значыць, што Кабмін зноў цалкам падкантрольны кіраўніку дзяржавы. Выключна прэзідэнт можа ўносіць на разгляд Вярхоўнай Рады кандыдатуры прэм'ер-міністра. Таксама толькі прэзідэнт мае права адпраўляць урад у адстаўку і цалкам фармуе сілавы блок. Прэзідэнт можа адмяняць указы ўраду і рэарганізоўваць органы цэнтральнага кіравання.

***— Вядома, што Партыя рэгіёнаў унутры неаднародная. Раней некаторыя яе лідэры (такія, як Клюеў і Ахметаў) выступалі супраць абмежаванняў паўнамоцтваў парламенту. Ці не паграджаюць апошнія папраўкі абвастрэннем канфлікту паміж групоўкамі ўнутры кіруючай партыі?***

— Змены ў Асноўны закон былі сапраўды зробленыя па ініцыятыве адміністрацыі прэзідэнта. І толькі факт гэтай ініцыятывы можна лічыць перамогай групы Віктара Фёдаравіча над унутранай апазіцыяй, якая бачыла ў парламенцкай сістэме гарантыю таго, што выканаўчая ўлада будзе з імі лічыцца. Навацыі наўрад ці спадабаюцца шматлікім сябрам Партыі рэгіёнаў. Нельга забываць таксама, што Сяргей Лёвачкін — кіраўнік адміністрацыі і галоўны ідэолаг рэформы — мае напружаныя асабістыя адносіны з прадстаўнікамі Ахметаўскай групы, да якіх, дарэчы, адносяць і старшыню ўраду Міколу Азарава. Апошні ў выніку змен у Канстытуцыі аказаўся папросту заложнікам прэзідэнта. Цяпер, каб адправіць яго ў адстаўку, Януковічу не трэба будзе кансультавацца з дэпутатамі. Дастаткова аднаго ягонага подпісу. А пра тое, што Азараў хутка вызваліць кабінет старшыні Кабміну, кажуць усе. Запланаваны на восень рост камунальных плацяжоў плюс падзенне рэйтынгу даверу да партыі і бюджэтны крызіс ствараюць падставу для падобнага кроку прэзідэнта. Іншымі словамі, новы закон быў патрэбны прэзідэнту ў тым ліку і для таго, каб у выніку пагрозы хутка змяняць склад міністраў, перакладаючы на іх адказнасць за дрэнны стан эканомікі. Так ці інакш, перамены паскораць працэсы дэцэнтралізацыі ў шэрагах Партыі рэгіёнаў. Пасля таго, як завяршацца прызначаныя на 15 кастрычніка мясцовыя выбары, трэба чакаць росту канфрантацыі паміж «белаблакітнымі», а магчыма нават расколу партыі.

***— А што будзе з малымі партыямі, якія ўваходзяць у склад кабінету? Маю на ўвазе камуністаў і партыю Літвіна.***

— Літвіну не пазайздросціш. Па-першае, ён як спікер губляе былы статус. Раней спікер кардынаваў працу ўсіх органаў парламенту, быў пасярэднікам паміж галінамі ўлады. Цяпер ён адказны хіба што за тэхнічную падрыхтоўку працы дэпутатаў. Але галоўнае ў іншым. Рэформа — гэта таксама адмена закону аб імператыўным мандаце, які дазваляў лідэрам фракцый неяк кантраляваць сяброў сваёй групы. Цяпер дэпутаты могуць галасаваць так, як захочуць. Сярод дэпутатаў Літвіна даўно існуе фронда на карысць Партыі рэгіёнаў. Сёння гэтай групе нічога не замінае перайсці ў іншую фракцыю. Тое ж самае і з камуністамі. Парламент вяртаецца ў часы дыфузных сітуатыўных большасцяў, якія будуць узнікаць пад галасаванне за асобныя законы. У кожным канкрэтным выпадку прэзідэнту трэба назбіраць неабходныя 226 галасоў. Танней купляць не фракцыі, а асобных парламентарыяў. Дарэчы, камуністы выступілі супраць паправак, аднак чамусьці пры гэтым папрасілі прэзідэнта, каб ён пакінуў іх у складзе Кабміна. Аргументацыя тут такая: для правядзення маштабных рэформаў трэба, каб ва ўрадзе было як мага больш прадстаўнікоў розных партый.

***— Ці прывядзе рэформа да змены твару апазіцыі?***

— Так. Цалкам мяняецца канфігурацыя парламенцкай апазіцыі. Што да фракцыі Юліі Цімашэнка, то яна застанецца маналітнай. Тыя, хто хацеў адтуль збегчы, даўно збеглі. Затое ў кантэксце адмены закону пра імператыўны мандат наступствы рэформы значаць развал фракцыі «Наша Украіна». На яе базе могуць з'явіцца як мінімум тры групоўкі — група Кірыленкі, група Юшчанкі і група Давіда Жванія. Аднак новы закон значыць не толькі дзяленне, аднак таксама канец унутранай барацьбы за лідэрства ў фракцыі «Наша Украіна», якую вялі тры згаданых кангламераты. Паколькі прадмету канфлікту — пасады кіраўніка фракцыі — няма, можна падумаць пра пачатак нейкага аб'яднання супраць агульнага праціўніка. І, акрамя таго, паколькі дэпутаты цяпер хутчэй маюць дарадчы голас, ім няма чаго губляць.

***— Ці сімвалічнае вяртанне ў прававы парадак часоў Кучмы адродзіць настроі Майдану і дасць імпульс апазіцыі?***

— Гэта не проста вяртанне ў 2004 год. У папраўках хаваецца адна вельмі небяспечная дэталь. Януковіч абіраўся па версіі канстытуцыі 2004 года. Такім чынам, з яе адменай яго цяперашні тэрмін становіцца нулявым. І, адпаведна, ён можа яшчэ тры разы балатавацца на пасаду кіраўніка дзяржавы. Натуральна, эмоцый з гэтай і іншых прычын хапае. БЮТ ужо пачаў старую песню з блакадай трыбуны ў зале Рады і патрабуе перагледзець рашэнне ад 30 верасня, паколькі суддзі не мелі права яго прымаць. Аднак пакуль актывізацыі грамадства не назіраецца. Магчыма таму, што мадэль парламенцкай рэспублікі, якая існавала амаль 6 гадоў, таксама аказалася далёка не ідэальнай. Пра Кучму і ягоныя фокусы ўсе неяк забыліся. Затое ў памяці захаваліся падзеі апошніх гадоў: бясконцыя ўрадавыя крызісы, бойкі падчас сесій, прызначэнні на пасады міністраў вельмі адыёзных палітыкаў, войны паміж урадам і прэзідэнтам і г.д.

***— 15 кастрычніка ў краіне пройдуць мясцовыя выбары. Якое іх значэнне ў глабальным плане? Якія вашы прагнозы?***

— Выбары павінны адказаць на пытанне, ці зможа апазіцыя скарыстацца серыяй правалаў ураду і фактычна адрадзіцца ў цяперашнім фармаце з цяперашнімі лідэрамі. Калі так, то гэта будзе рэнесансам Цімашэнка і Юшчанкі. Калі не — пачнецца перазагрузка апазіцыі, якая можа цягнуцца аж да парламенцкіх выбараў 2012 года. Выбары, у любым выпадку, будуць цікавымі з пункту гледжання развіцця палітычных тэхналогій. Партыя рэгіёнаў ідзе на іх з ноў-хаў. Замест таго, каб падрабляць вынікі, як у 2004 годзе, яна дробіць аранжавых, стварае фантомныя партыі з назвамі, падобнымі на назвы вядучых партый апазіцыі, надае імідж галоўнай партыі апазіцыі праекту «Сильная Украина», лідэр якой Сяргей Цігіпка ёсць сябрам ураду Азарава. Таму таксама цікава, ці з'есць такую нажыўку электарат?

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ФЕЛІКС КУЛАЎ



Партыя «Ар-Намыс» («Годнасць»), лідэрам якой з'яўляецца экс-прэм'ер Кыргызстана Фелікс Кулаў, стала чарговым сябрам незвычайнага інтэрнацыяналу, які партыя «Единая Россия» (ЕР) будуе на тэрыторыі Садружнасці. Кіраўніцтва «Ар-Намыс» падпісала дамову ў Маскве з адзінаросамі, адпаведна якой ЕР бярэ «Ар-Намыс» пад сваё крыло. З расійскага боку дамову падпісаў Барыс Грызлоў. Гэта дамова дала палітолагам падставу казаць пра тое, што ў партыя «мядзведзяў» ствараюць нейкі свой Інтэрнацыянал. Раней падобныя пагадненні з партыяй Грызлова заключылі Дэмакратычная партыя Малдовы і партыя «За справядлівую Грузію». У 2005 годзе ЕР падпісала дамову пра супрацоўніцтва з Партыяй рэгіёнаў ва Украіне. У ЕР таксама ёсць дамовы пра супрацоўніцтва і забеспячэнне фінансавай дапамогі кіруючым партыям у сепаратысцкіх грузінскіх рэгіёнах — Паўднёвай Асеціі і Абхазіі. Самы вялікі парадокс міжнароднай працы адзінаросаў у тым, што ў Расіі ЕР лічыцца партыяй правага цэнтру. Між тым, у Малдове і ва Украіне яна працуе хутчэй з левымі. А ў іншых рэгіёнах — з партыямі папуліцкага кшталту. Аднак гэта не вельмі бянтэжыць лідэраў ЕР. Па іх словах, крытэрый падбору саюзнікаў адзіны — яна павінны як мага больш эфектыўна лабіраваць палітычныя і эканамічныя інтарэсы Расіі ў сябе на месцах. Цікава, што заходнія палітолагі ацэньваюць такія метамарфозы як пазітыўны знак. Расія больш не разглядае свет з пункту гледжання «сяброў» і «ворагаў», а вылучае па структуры «інтарэсаў».

### МАРЫНА СІЛЬВА



Менавіта кандыдат бразільскай партыі Зялёных, а не яе апанентка з Партыі працоўных Дзілма Руссэф стала героем прэзідэнцкіх выбараў. Дзілма не здолела перамагчы ў першым туры менавіта з-за экалагічнага кандыдата, які набраў сенсацыйныя 19 працэнтаў. У Дзілмы аказалася 42 працэнта, а ў яе галоўнага праціўніка Жазэ Сэрра з Бразільскай сацыял-дэмакратычнай партыі (PSDB) — 32 працэнты. Феномен Марыны, чыя структура дастаткова слабая, тлумачаць яе харызмай. Шмат хто лічыць, што яна лепш увасабляе левую ідэю, чым Дзілма. Акрамя таго, Сільва — чарнаскурая, што прыцягвае да яе сімпатыі чарнаскурых бразільцаў. Дарэчы, Марына Сільва пачынала свой шлях у палітыцы ў шэрагах Партыі працоўных, пакуль у час знаходжання на пасадзе міністра экалогіі не пасварылася з прэзідэнтам Лула да Сільва з-за крытычнай сітуацыі ў лясах Амазонкі. Цяпер Марына думае, каго падтрымаць у другім туры. Спачатку хадзілі плёткі, што яна выступіць у падтрымку Жазэ Сэрра, аднак пакуль дакладна не вядома, каго ўсё ж падтрымае Марына.

### ДЭВІД КАМЕРОН



Кабінет Камерона існуе толькі з чэрвеня, аднак ужо ўвайшоў у гісторыю. Адзін з урадавых дэпартаментаў легалізаваў на тэрыторыі Англіі і Уэльсу паганскі культ старадаўніх кельтаў. З гэтага часу створаная ў 2003 годзе грамадская арганізацыя «Сетка Друідаў», якая называе сябе спадчынніцай кельцкіх жрацоў, атрымала афіцыйны статус рэлігійнай канфесіі, што дае ёй права праводзіць абрадавыя цырымоніі і прымаць ахвяраванні ад адэптаў паганства. Цікава, што папярэдні ўрад лейбарыстаў адмаўляўся даць паганцам легальны статус. Спатрэбілася 4 гады барацьбы за правы друідаў публічна маліцца сваім духам. Ужо апублікавана канчатковая версія статуту супольнасці сучасных язычнікаў. У дакуменце на 21 старонцы прадстаўлены шырокі комплекс правілаў, якія тычацца розных аспектаў жыцця адэптаў секты. У ім таксама рэгулююцца рэлігійныя рытуалы. Так, паслядоўнікі старажытных містычных вераванняў збіраюцца на працягу года і праводзяць 8 буйных рэлігійных фэстаў, рытуальныя набажэнствы, праўда, без прынясення чалавечых ахвяр. Застаецца дадаць, што паганцаў легалізавалі адразу пасля візіту Папы Рымскага на Альбіён. Цікава, ці ёсць у гэтым нейкая заканамернасць?

СПАДЧЫНА

# ЭКЗАМЕН ДЛЯ МІНІСТРА ЛАТУШКІ

Аляксей ХАДЫКА

**У працэсе аднаўлення забудовы раёнаў старой часткі цэнтра Мінска разгараецца чарговы скандал. 29 верасня на пасяджэнні Навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, насуперак усякай логіцы, адкінуты прапанаваны Таварыствам аховы помнікаў праект рэканструкцыі правай часткі вуліцы Зыбіцкай (былой Гандлёвай). Ухвалена распрацаваная па замове забудоўшчыка КУП «Мінская спадчына» прапанова КУП «Мінскпраект», якая нагадвае, на думку экспертаў, штучны цацачны макет. Больш за тое, парушае гістарычную трасіроўку вуліц і маштабнасць аб'ёмаў будынкаў.**





Гістарычны фотаздымак і праектная прапанова Андрэя Ларры і Антона Вантуха

Трохпавярховыя гмахі, замест адна- і двухпавярховых ладных дамкоў, назаўсёды закрыюць перспектыву панарамы Верхняга горада з боку набярэжнай Свіслачы, якую далікатна зберагалі папярэднія пакаленні мінскіх архітэктараў.

У тых жа кварталах, толькі па няцотным баку Зыбіцкай, ужо сёння мінчукі могуць назіраць плён працы таго ж самага забудоўшчыка ў межах гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гістарычны цэнтр Мінска» — муляжы ў псеўдагістарычным стылі, скрозь якія паўсюль прабіваюцца сучасныя дызайнерскія рашэнні. Наверсе пагорка Верхняга горада «Мінская спадчына» шчыруе, ператвараючы гмахі старажытнага кляштара бернардынцаў у гасцінічны комплекс. Таму, калі да Таварыства аховы помнікаў дайшла інфармацыя пра распрацоўку планаў забудовы паміж Зыбіцкай і Свіслаччу, яго кіраўніцтва вырашыла рыхтаваць свой праект. Выконваючы яго ў поўнай адпаведнасці з архіўнай дакументацыяй, нарматывамі заканадаўства і рэгламентамі Генеральнага і Дэтальнага плана рэканструкцыі і рэстаўрацыі Мінска, прынятага ў 2006 годзе Мінгарвыканкамам і зацверджанага прэзідэнтам.

Таварыству аховы помнікаў пашанцавала, калі ў 2009 годзе ў яго архітэктурную секцыю прыйшлі маладыя амбітныя прафесіяналы, сярод якіх найбольшай актыўнасцю вылучаліся Андрэй Ларры і Антон Вантух. Яны і ўзялі на сябе ініцыятыву і цяжар адказнасці за распрацоўку эскізнага праекту. Таварыства аховы помнікаў аказала ім метадычную дапамогу, забяспечыўшы дзеючай нарматыўна-прававой дакументацыяй у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Будаўнічымі нормамі Беларусі хлопцы выдатна валодалі самі, працуючы ў галіне архітэктурнага планавання.

Па хадайніцтве Таварыства аховы помнікаў Андрэю і Антону адчыніліся архівы — кінафотадакументаў, навукова-тэхнічнай дакументацыі і нацыянальны гістарычны. Адзін з сябраў таварыства, які займаецца зборам базы дакументаў па забудове гістарычнага Мінска, Павал Растоўцаў, вывучаючы раён Гандлёвай-Зыбіцкай, наведаў архіўныя сховішчы Пецярбурга: там засталася дакументацыя пасляваеннага Генеральнага плана нашага горада. І ў ёй шмат матэрыялаў па гістарычным цэнтры. Абагульнюўшы звесткі абмераў і фотафіксацый, група выканала план і камп'ютарныя графічныя 3D версіі комплекснага аднаўлення забудовы правага боку вуліцы да набярэжнай Свіслачы. Эскізную і архітэктурную прапановы. Цікава, што ў гэты момант КУП «Мінскпраект» распрацоўваў адразу будаўнічую стадыю праекта — з парушэннем заканадаўства, мінуючы эскізную і архітэктурную стадыі.

«Будаўнічы праект «Мінскпраекта» таксама меў стадыю комплекснага навуковага вышукання, якую выканалі для яго спецыялісты «Белпраектрэстаўрацыі», — тлумачыць кіраўнік Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч. — Іх даследаванні, аднак, прайгралі падобнай працы нашага таварыства ў паўнаце выкарыстаных крыніц. Паўлам Растоўцавым за ўласныя сродкі былі здабытыя і перададзеныя таварыству фотаматэрыялы з нямецкіх архіваў. Таму архіў гістарычных дакументаў па Мінску канца XIX — пачатку XX стагоддзяў у таварыстве большы, чым ва ўстанові, якія адмыслова фінансаваліся з бюджэту. Пытанне: чаму на энтузіязме зроблена болей, чым на фінансаванні?»

Ужыўшы матэрыялы зробленай немцамі ў 1918 і 1941 гадах аэрафотафіксацыі, праектанты Таварыства аховы помнікаў здолелі аднавіць старую структуру кварталаў з традыцыйнай парцэльнай планіроўкай і нават планы асобных дамоў. А «Мінскпраект» не звярнуўся нават да абмерных чарцяжоў, якія захоўваюцца ў Архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі на пл. Свабоды і выкананыя ў 1950-я гады БРТІ пры зносе гістарычнага кварталу. Як выявілася, абмеры планаў і фасадаў практычна супадалі з праектамі, датаванымі другой паловай XIX стагоддзя з Нацыянальнага гістарычнага архіву. Параўноўваючы дакументы дзвюх эпох, спецыялісты таварыства дакладна ўсталявалі, якія ідэі ў XIX стагоддзі рэалізоўваліся, а якія заставаліся на паперы.

Прычынай адхілення часткі праектаў у XIX стагоддзі сталася парушэнне іх аўтарамі тагачаснага горадабудаўнічага рэгламенту: закон выконваўся больш адказна і строга, чым сёння. Правы бок Гандлёвай-Зыбіцкай, бліжэйшы да Свіслачы, адмыслова забудоўваўся ярусна, пачынаючы ад аднапавярховых дамоў на ўзбярэжжы з пераходам да двухпавярховых. Толькі адзін будынак, у адрозненне ад прапанаваных «Мінскпраектам» маштабаў рэгенерацыі, аказаўся трохпавярховым. Усё рабілася, каб не закрываць перспектыву на Верхні горад і яго архітэктурныя дамінанты.

На думку Антона Астаповіча, Ларры і Вантух стварылі бездакорны з пункту гледжання гісторыі, архітэктуры і аднаўлення спадчыны апорны праектны план, адпаведныя яму графічныя рэканструкцыі асобных будынкаў. Іх матэрыялы дазвалялі пакінуць спрэчкі толькі па дэталях.

Самае асноўнае — адраджэнне і захаванне гістарычнай планіровачнай структуры — аказалася дасягальным. Вынік — праца Ларры і Вантуха паўмесяца таму была ўхвалена старшынёй камітэта архітэктуры Мінгарвыканкама Віктарам Нікіціным. Ён абяцаў падтрымаць іх ідэі на паседжанні Навукова-метадычнай рады 29 верасня, куды альтэрнатыўны праект са згоды Міністэрства культуры прадставілі разам з афіцыйным. Прапанова Таварыства аховы помнікаў мела станоўчае заключэнне навуковага савета архітэктурнага факультэта БНТУ, у той час як афіцыйны праект, па традыцыі, на экспертную ацэнку ўвогуле не накіроўваўся. Але цуду не адбылося.

Прычыну прыняцця канфузнага рашэння Антон Астаповіч бачыць у спробе чыноўнікаў прыкрыць марнатраўства дзяржаўных грошай. Бо як іначай яны наважыліся ісці супраць закону, Дэтальнага плана рэканструкцыі і рэстаўрацыі Мінска, які прадугледжвае на гістарычных тэрыторыях дакладнае адраджэнне сеткі вуліц, планіровачнай структуры, аб'ёмаў і фасадаў будынкаў. Тое, што адсутнічае ў прапанове «Мінскпраекта». Але ў 2008 годзе па замове «Мінскай спадчыны» на правым баку Зыбіцкай пракалі калектар, не парупіўшыся папярэдне выканаць планіровачную прывязку да наступнай стадыі праекту. Калектар кінулі ў зямлю, як у нейкіх Шабанах, з улікам нарматываў будаўніцтва на новых тэрыторыях. І калектар дыктуе планіроўку: замест гістарычных 12-ці шырыня вуліцы дасягае 19-ці метраў.

Сваім рашэннем 29 верасня Навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры прапанавала зноў ісці шляхам фальсіфікацыі гістарычнай спадчыны. Што асабліва крыўдна, паколькі тут, на невялікім квартале старажытнага Мінска, абставіны давалі шанец выканаць ідэальную рэгенерацыю гістарычнай забудовы. Замест гэтага створаны прыкры прэцэдэнт, калі ў межах ахоўнай тэрыторыі зацвярджаецца рэалізацыя адвольнага праекту. Ставіцца пад пытанне прапісаная ў Дэтальным плане задача навуковага аднаўлення старога кварталу па іншым баку Свіслачы, на ўскрайку ўчастка ля Траецкага кляштара ўздоўж выставачнага комплексу (што падлягае зносу), які нядаўна быў перададзены інвестарам з Аману. Бо яго структура звязвалася з трасіроўкай квартала на Зыбіцкай як адбітак у люстэрку.

І апошняе: на пасяджэнні навукова-метадычнай рады галасаванне па рашэнню, насуперак правілам, не праводзілася. Старшыня рады, намеснік міністра культуры Віктар Кураш папросту агучыў праект пратаколу, які аддаў перавагу прапанове КУП «Мінскпраект». Адпаведна, да яго зацвярджэння міністрам культуры Паўлам Латушкам яшчэ ёсць магчымасць вярнуцца да грунтоўнага разгляду пытання, каб прыняць рашэнне, якое б адпавядала не толькі навуковай і гістарычнай праўдзе, але і дзеючаму заканадаўству. І абвергнуць скепсіс блогераў у інтэрнэце, якія ўжо кіпяць пытаннямі кшталту: «Ну што, вы чакалі, каб новае кіраўніцтва Мінкульта адрознівалася ад старых бюракратаў?»




Прапанова «Мінскпраекта»

РАЗВАЖАННІ

# ВОСЕНЬСКАЕ ЖНІВО КІНАФЭСТАЎ

Андрэй РАСІНСКІ

**Восень — час кінажніва. Два вераснёўскія фэсты сталіся знакам таго, што беларуская кінаіндустрыя змяняецца.**



www.gallery.signis.by

Цяпер фестываль дэманструе фільмы, якія можна ўключаць у падручнікі па кінамастацтве. Вырас узровень і сталых удзельнікаў кінафэсту

## «Магніфікат–2010» — пераломны год

Фестываль «Магніфікат» з'явіўся на свет у 2005 годзе, на тэрыторыі кляштара ордэна францысканцаў, у вёсцы Удзела Глыбоцкага раёна, ля помніка святому Максімільяну Кольбэ. Такі выбар стартавай пляцоўкі невыпадковы. «Магніфікат» — міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх фільмаў і тэлепраграмаў. А святы Максімільян Кольбэ сам друкаваў газеты, выступаў на радыё.




Старэйшы брат «Магніфіката» — фестываль у мястэчку Максімільяна Кольбэ — Непакалянаве ў Польшчы. Рэжысёр Юры Гарулёў пабываў на гэтым фэсце і стаў нязменным арганізатарам «Магніфікату».

Заснавальнікі фэсту — Каталіцкая асацыяцыя для камунікацый «Signis-Беларусь», Віцебская рыма-каталіцкая дыяцэзія, студыя «Стоп-кадр» — пры падтрымцы глыбоцкіх уладаў. «Магніфікат» традыцыйна праводзіўся ў Глыбокім, Мосары і Удзела.

Сёлетні міжнародны фэст, шосты па ліку, пашырыўся і распачаўся не на Віцебшчыне, а ў сталіцы — у Мінскай архікатэдры, што ўвосень святкуе юбілей, прывабіў італьянскіх і польскіх дыпламатаў. Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка выступіў з віншаваннем. Пасля аднадзённых мінскіх сматрынаў фэст вярнуўся на Глыбоччыну.

Сёлетняя праграма была, бадай, наймацнейшая за ўсе гады. Калі напачатку, калі фестываль толькі з'явіўся, Гран-Пры не прысуджалі: майстэрства фільмаў і тэлепраграмаў назапашвалася, то цяпер фестываль дэманструе фільмы, якія можна ўключаць у падручнікі па кінамастацтве. Вырас узровень і сталых удзельнікаў кінафэсту.

Так, Максім Міхальцоў прадставіў дакументальную карціну «Лямпа не гасне» пра веру і пераадоленне наркаманіі. Колькі гадоў таму рэжысёр паказваў на «Магніфікаце» сваю раннюю стужку, таксама прысвечаную пякучай праблеме. Карціна была прасякнутая любоўю і спачуваннем, але аўтару бракавала кінематаграфічнага досведу. Цяпер ягоная стужка — па-майстэрску завершаны дакумент пра Божы провід у людскіх лёсах.

Фестываль адкрыў гледачам новую беларускую студыю — у імя святога Яна Воіна. Іншая карціна гэтай праваслаўнай кінакампаніі — дакументальны фільм «Галоўная роля» Віталя Любецкага. Гераіня карціны Ксенія прайшла да веры складаны шлях: ад легкадумнага жыцця, наркотыкаў, праз смерць бацькі — да духоўнага ачышчэння. Карціна кранае пранізлівай спавядальнасцю і хрысціянскім гартам. Аператар стужкі — муж гераіні.

Вольга Дашук распавяла пра «Край Белавежскі». Гэта маўклівая і пластычная замалёўка пра Белавежскія касцёлы і цэрквы, пра гісторыю — і пра прыгажосць створанай Богам прыроды. Валерыя Скварцова з «Храмавым кальцом Браслаўскага Паазер'я», знятым на «Беларускім відэацэнтры», працягнула тэму архітэктурнай хрысціянскай спадчыны.

А вось героем стужкі Уладзіміра Арлова стаўся ксёндз-пробашч Чырвонага касцёлу Уладзіслаў Завальнюк, а дакладней, бернардзінскі крыж з Віленскага кляштара. Падчас воднай пілігрымкі гэты крыж — пад кіраўніцтвам ксяндза-пробачша — быў дастаўлены з Вільні ў Будслаў.

Айцец Ігар Сабко з украінскага фільма «Зразумець чалавека» на фэсце таксама быў. Карціна Аляксандра Сталярова, складзеная як дзённік і нарысы пра сустрэчы адналаснікаў і нараджэнне дачкі — жывы аповед пра любоў, якая застанецца, нават калі і памяць знікае.

А вось расійская карціна Аляксандра Купрына «Экзарх Фёдараў» з зацікаўленасцю расказвае пра кіраўніка рускай грэка-каталіцкай царквы, закатаванага бальшавікамі.

На экране — фільмы Польшчы, Германіі, Аўстраліі, Індыі, Расіі, Грузіі, Літвы, Канады, Харватыі.

Упершыню ў кінафэсце ўдзельнічала і стужка з Іспаніі. Яна была прысвечана «Святому Каласансу», які здзейсніў рэвалюцыю ў адукацыі. Святы адкрыў першую ва ўсёй Еўропе бясплатную школу для дзяцей беднаты. Заснаваў ён і рэлігійны ордэн, які меўся іх апекаваць.

Грузінская стужка Роланда Барашвілі «Прытулак» — пра дом састарэлых. Камера тактоўна і ўважліва ўглядаецца ў твары старых, якія наблізіліся да мяжы, слухае аповеды, спачувае.

Цвіком фэсту сталі фільмы з Італіі, якой быў прысвечаны цэлы дзень: «Ён ахвяраваў свой дух дзеля людзей — смерць Пантыфіка», «Канец свету», «Дзённік горнага святара», «Таямніцы Фацімы», «Дон Карла Ньекі. Святар, які шукаў Бога сярод людзей».

Гэта высокае рэлігійнае кіно. «Дзённік горнага святара» Стэфана Саверыёні пра няўрымслівага святара, які служыць у маленькай горнай парафіі, спрачаецца з класічнай ігравой стужкай Рабэра Брэсона «Дзённік вясковага кюрэ». А карціна Карла Б'язэ «Дон Карла Ньекі» паказвае нам святара, які да апошняга апекаваўся дзецьмі і нават завяшчаў ім уласныя вочы.

Дзеці ў глыбоцкай бібліятэцы з ахвотай абіралі на фэсце найлепшыя мультфільмы пра святых, анёлаў і дабрыню. Лялечны мультфільм Галіны Бяды «Руфь» — паводле біблейскага аповеду — быў яшчэ складаным для маленькіх гледачоў. Затое захапленне выклікаў мультфільм, зроблены самімі дзецьмі — латвійскімі і беларускімі — «Як Несцерка і Спрыдзіціс шчасце шукалі».

«Магніфікат» стаўся заўважным. Гэта выклікала і палітычныя інтрыгі.

Як распавёў сябра БХД Аляксей Шэін, які мусіў прадставіць на фэсце сваю стужку «Хрыстос забаронены», па патрабаванні Леаніда Гулякі карціна пра пратэстантаў-дысідэнтаў, ужо ўключаная ў каталогі, была знятая з паказаў. Фэсту абяцалі непрыемнасці, калі фільм пройдзе. Іншую карціну — латвійскую стужку «Пскоўская духоўная місія» пра рэлігійнае жыццё падчас нацысцкай акупацыі — папрасіла зняць сама рэжысёрка.

Але інтрыгі — непазбежная частка фэстаў, што моцна стаяць на нагах. Як пракаментавала кіназнаўца і сябра журы Галіна Шур: «Які фестываль без скандалаў? «Магніфікат» адбыўся».

Гран-Пры сёлетняга кінафэсту атрымаў фільм Стэфана Саверыёні «Дзённік горнага святара». Лепшай тэлепраграмай прызнаная «Блакадная вера» пра хрысціянскае служэнне ў блакадным Ленінградзе. Найлепшым дакументальным фільмам сталася грузінская стужка Роланда Барашвілі «Прытулак». Прыз за рэжысуру дастаўся Аляксандру Купрыну за «Экзарха Фёдарава». А дыплом «За лепшую аператарскую работу ў паказе харастваа свету» атрымаў фільм Давіда Дэмекеліса «Канец свету» пра місіянера-фатографа з Вогненнай Зямлі.

«Магніфікат» — унікальны фестываль на тэрыторыі СНД. І нягледзячы на шасцігадовы век, — ужо не дзіця.

## Беларускі дэсант на «Кінашоку»

Калі «Магніфікат» завяршыўся, у Анапе распачаўся 19-ы адкрыты міжнародны фестываль краінаў СНД і Балтыі «Кінашок». Беларускае кіно, пра якое ўжо паспелі забыць, упершыню на постсавецкай прасторы было прадстаўленае асобнай праграмай. Прэзентацыя называлася «У фокусе — Беларусь». У праграме было 10 стужак, прэс-канферэнцыі і сустрэчы з беларускімі творцамі. А Святлана Зелянкоўская нават праспявала з Мікітам Міхалковым.



www.kinoshock.ru

**Адкрыццё праграмы «У фокусе — Беларусь». Андрэй Кудзіненка, Святлана Зелянкоўская і Аляксандр Кахановіч**

Карціну выхаванца Пташука Дзмітрыя Лася «Трамвай у Парыж» пакуль мала хто бачыў. Але, як сцвярджаюць расійскія сведкі, «за яе хварэлі на глядацкім конкурсе «ТВ-шок».

Стужка Аляксандра Колбышава «Ваўкі» была прадстаўленая па-за конкурсам. Яе пабачылі не ўсе, але водгукі былі станоўчыя. Беларускія гледачы неўзабаве самі ацэняць гэту экзістэнцыйную кінатрагедыю: яе рэкламны ролік ужо ідзе ў кінатэатрах.

Вязень уцякае ў ГУЛАГаўскага цягніку — і хаваецца ў роднай вёсцы. Адны мясцовыя жыхары яго ратуюць, другія — на героя палююць. Для зляканай сённяшняй Беларусі — карціна актуальная.

Але найбольшы скандал выклікала стужка Андрэя Кудзіненкі «Масакра», якой фестываль адкрываўся.

Гэта, як кажа рэжысёр, бульба-хорар, калі і страшна, і смешна. Пастаўлены ён па матывах «Локіса» Мэрымэ, толькі дзеянне перанесенае ў Беларусь пасля падаўлення паўстання Кастуся Каліноўскага. У палац да графа-пярэваратня прыязджае расійскі авантурыст, які заляцаецца да нявесты графа. Ёсць і госці — новы гаспадар палацу — расійскі генерал і дробная шляхта, гатовая служыць свежым уладам. Помста графа-мядзведзя завяршыцца крывавай масакрай.

Расійскіх крытыкаў абурыла, што беларускі мядзведзь-нацыяналіст дзярэ расійскіх гасцей. Не спадабаліся і кпіны з «вялікай рускай літаратуры». Затое майстэрства Андрэя Кудзіненкі, які «з хвацкасцю фокусніка» мяшае «містычны сімвалізм, камедыю, лірычную драму», гледачы ацанілі.

«Масакра» вельмі жанравае кіно — для ўдзячных заўзятараў (сярод іх і аўтар гэтых радкоў). З «Кінашоку», які аддаў перавагу аўтарскаму кіно Шарунаса Бартаса, стужка вярнулася без узнагарод.

Але розгалас атрымаўся значным.

ФЕЛЬЕТОН

# ФІЗКУЛЬТ-ІНТЭГРАЦЫЯ

**Лёлік УШКІН**

**Апошнім часам адносіны паміж Масквой і Мінскам апісваюцца з дапамогай метафар, якія азначаюць фізічныя дзеянні і рухі. Іх цалкам дастаткова для невялікага курсу гімнастыкі.**




### Хотели президента наклонить...»

— Фізкульт-прывітанне, супрацоўнікі цэху па вытворчасці айчынных шайбаў! Пачынаем ранішнюю гімнастыку. Першае практыкаванне — нахіленне прэзідэнтаў. Хуценька ўсе разлічыцеся на першы — другі. Зараз першыя нумары — «адмарозкі». Другія — «прэзідэнты». Цяпер «адмарозкі» па камандзе пачынаюць нахіляць «прэзідэнтаў». Пачалі! Нахіляем, нахіляем... Пятроў, ты што, ідыёт? Што значыць — «так»? Я разумею, што ты нумар першы. Я ў тым сэнсе, што ты па-ідыёцку нахіляеш «прэзідэнта». Ідэя практыкавання ў тым, каб ты не здолеў яго нахіліць. Ён жа непахісны. Расхілі прэзідэнта ў позу поўнай шматвектарнасці. Вось так.

### «Руководство России цапает нас за разные части тела»...

— Хапаць суседа за розныя часткі цела — наступная задача. Працуем рытмічна на раз-два-тры. На раз — абіраем частку, на два — заносім рукі, на тры — хапаем. Раз-два-тры. Раз-два-тры... Не халтурым! Пятроў, ты памятай, што ты кіраўніцтва Расіі, а не Еўрасаюза. Што ты з ім цацкаешся? Хапай брутальней і актыўней! Вось так, Іваноў. Я яшчэ ж казаў за розныя часткі цела, а ты зацыкліўся на адной. Цябе што, тут мёдам намазана? Вось тут яго хапні! І вось тут!

### «Хотели президента наклонить — получилось наоборот»

— Зараз вельмі важнае практыкаванне. Нахіленне прэзідэнтаў і атрыманне «наоборот». Першыя нумары ўзялі ў рукі ручныя гімнастычныя нахілятары і працуем з іх дапамогай. Пятроў, што ты тут панахіляў? Чаму партнёр у коме? «Наоборот» — гэта значыць, што твой партнёр павінен яшчэ дыхаць і бубнець: «Дай Бог, чтобы они, безмозглые, дальше вели эту кампанию». Адкачай таварыша!

### «Мы выкарабкались из той ситуации, в которую нас поставила Россия»

— Нарэшце паспрабуем разам дружна і весела выкараскацца з сітуацыі. Так, усе прынялі патрэбную пазіцыю. Пятроў, мне не патрэбна «Камасутра»! Нагу трэба вось так, руку вось так, а гэты орган сюды. Увага — старт! Караскаемся. Караскаемся, Іваноў! Я кажу — караскаемся з пазіцыі, у якую нас паставілі, а не выпаўзаем з яе на карачках. Прычым задам. Стоп. Усе, акрамя Іванова, — малайцы!

### «Мы наклонились и попытались взлететь»

— На гэтым сёняшнія заняткі заканчваюцца. На наступным тыдні мы асвоім новае практыкаванне — нахіленне са спробай паляцець. Адразу адзначаю — ляцець можна толькі ў Іран і Венесуэлу. На гэтым усё... Усім фізкульт-прывітанне!

АГЛЯД

# ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

## ФОТАГРАФІКА



1 кастрычніка ў Інстытуце Гётэ ў Мінску ў рамках святкавання 50-годдзя народнага фотаклуба «Мінск» адчынілася выстава нямецкага майстра Ёрга Айднера «Фотаграфіка» (працуе да 15 кастрычніка).

Якое дачыненне мае немец да мінскага клуба? Усё вельмі проста: прыехаўшы вучыцца ў мінскай Політэхніцы ў 1970-я, ён захапіўся фотамастацтвам. У 1975 годзе прыйшоў у клуб, дзе асновы рамяства спасцігаў у Міхаіла Жылінскага... У часы росквіту здымкаў на фотастужку і дамінавання чорна-белай карцінкі выкарыстанне эфектаў графічнага мастацтва вызначыла з'яўленне чатырох экспазіцый пад аналагічнай назвай «Фотаграфіка».

Вартасць тых старых работ, па словах старшыні клуба Яўгена Казюлі, з часам не губляецца, таму ў межах юбілейных мерапрыемстваў хутка адбудзецца рэтрапаказ «Фотаграфіка. Сорак год пасля». Зараз Ёрг Айднер эксперыментуе з традыцыйнай формай новымі і старымі тэхнічнымі сродкамі: выкарыстоўваючы фоташоп для лічбавых здымкаў, апрацоўваючы адсканаваныя са стужкі выявы, здымаючы без фільтру, дамагаючыся кантрастаў з рэзкімі абрысамі прадметаў. Чорна-белае фота суседнічае з каляровым, дзе колеравыя гармоніі — элемент стварэння настрою.

Галоўным героямі яго кампазіцый выступае краявід, куткі прыроды і кранутай дзейнасцю чалавека прасторы, ландшафты — Германіі, Італіі, Ісландыі, Індыі і іншых краін, адлюстраваныя з надзвычай паэтычным пачуццём.

## ГАБЕЛЕН

У Палацы мастацтваў можна яшчэ паспець наведаць экспазіцыю габеленаў майстроў дома культуры «Zacisze» з Польшчы, твораў, якія пераконваюць, што ткацкае рамяство можа супернічаць з абсалютна любой тэхнікай выяўленчага мастацтва.

У працах лідэра творчай групоўкі Марыі Красоўскай — і матывы знакамітага мастака чэшскага мадэрну Альфонса Мухі, і варыяцыі на тэмы слуцкіх паясоў, і акварэльная лірыка мяккіх колераў у адлюстраванні постаці закаханай дзяўчыны на беразе возера за чытаннем паэтычнага зборніка, і ўрбаністыка разнаколерных дамоў тыповага гістарычнага прадмесця.

Яшчэ адзін адметны аўтар, Марыя Кірыляк, пераносіць у габелен выразнасць эстэтыкі касцельных вітражоў. І яшчэ — нацюрморты, краявіды, дэкаратыўныя кампазіцыі. Здаецца, няма тэм і сюжэтаў, непадуладных выхаванцам школы пад кіраўніцтвам Тэрэсы Шчэпаньскай, якая і паўстала па яе ініцыятыве 22 гады таму. Застаецца падзякаваць супрацоўнікам Польскага інстытуту ў Мінску за арганізацыю гэтай выдатнай выставы.



## ТЭХНА-АРТ

«Тэхна-Арт» у Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» — сёмы паказ серыйнага праекта, прысвечанага тэматыцы сучаснага дызайнерскага мастацтва, звязанага са светам прамысловасці і тэхнічнай творчасці, які, аднак, не пачынае быць надакучлівым.

Нетрадыцыйнае спалучэнне матэрыялаў у інсталяцыях, актуальнасць тэм у плакатных выявах і відавочная прысутнасць жывых ідэй у большасці твораў адпавядаюць слогану гэтага вернісажу пераважна маладых мастакоў — «Знак якасці». Варта звярнуць увагу хоць бы на працу Уладзіміра Прыгарніцкага «Два светы — два знакі», каб зразумець, што маладое пакаленне здольнае выказаць сур'ёзны сацыялагічны тэзіс — пра адсутнасць настальгіі па СССР — і зрабіць тое ў надзвычай выразнай форме. Можна пагадзіцца з заявай арганізатараў, што праект «Тэхна-Арт» ужо больш не даводзіць сваё права называцца мастацтвам, ён сам з'яўляецца знакам якасці.

## SOS

У Музеі сучаснага мастацтва з 5 па 24 кастрычніка таксама чарговая — «пятая ці сёмая», па словах дырэкцыі музея — экспазіцыя суполкі «Артэль», якую ачольвае Рыгор Несцераў.

Гэтым разам калектыўная выстава пад назвай «SOS» прысвячаецца Сусветнаму дню аховы жывёл 4 кастрычніка, чаму, трэба адзначыць, цалкам адпавядаюць анімалістычныя сюжэты самога Несцерава, выкананыя ў прывідна-пуантылісцкай манеры. Большасць аб'яднаных у суполку жывапісцаў і графікаў — Уладзімір Ганчарук, Валянцін Губараў, Рыгор Іваноў, Сяргей Рымашэўскі, Алена Шлегель, Сяргей Малішэўскі, Сяргей Пісарэнка, Мацвей Басаў, Аляксандр Забаўчык, Васіль Касцючэнка — творцы добра вядомыя, як тым, што значная іх частка ў той ці іншы перыяд уваходзіла ў кіраўніцтва Саюза мастакоў, так і тым, што сваімі працамі заўсёды прыцягвала павышаную ўвагу аматараў.



Розныя па стылі і манеры аўтары, чые работы, сабраныя разам, пакідаюць некалькі хаатычнае ўражанне мастацкага салону, тым не менш здольныя задаволіць цікаўнасць наведвальніка. Тут і вострыя сацыяльна-сатырычныя нэалубкі Губарава, і шчымлівыя інтанацыі Рымашэўскага, і колерава-фактурныя эксперыменты Забаўчыка і Басава. І галоўнае — дэманструюцца выключна свежыя працы 2009–2010 гадоў.

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1000

Падпісана да друку 8.10.2010. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.